Дзяржаўная ўстанова культуры
“Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Каляндар дат, падзей Кобрыншчыны

*краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2017 год*



Кобрын 2017

ББК 91.(4Беі)+92
К 17

***Складальнік:***

*С. Д. Курачук* - галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі

***Камп'ютарны дызайн вокладкі:***

*П. С. Грыневіч* – інжынер-праграміст

**Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны** : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2017 год / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук, камп'ютарны дызайн вокладкі П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2017. – 83 с. : каляр. фота.

# Прадмова

Краязнаўча-бібліяграфічны каляндар змяшчае паўнатэкставыя звесткі аб знамянальных падзеях Кобрыншчыны на 2017 год і падрабязны спіс крыніц да іх.

Даты, уключаныя ў каляндар, адлюстроўваюць падзеі і факты гісторыі, грамадскага, палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця рэгіёна; памятныя даты вядомых людзей, біяграфіі якіх звязаны з краем.

Спісы да юбілейных дат уключаюць кнігі і артыкулы з газет і часопісаў. Матэрыял размешчаны ў наступным парадку: спачатку кнігі па алфавіту, потым артыкулы з газет і часопісаў у адваротным парадку (у межах года – па алфавіту).

“Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны” ілюстраваны.

Выданне адрасуецца ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца сваёй малой радзімай ці выкарыстоўвае краязнаўчыя звесткі ў прафесійнай дзейнасці.

Краязнаўчы каляндар выкарыстоўваецца пры планаванні работы бібліятэкі, правядзенні масавых свят і юбілейных мерапрыемстваў, пры складанні паўнатэкставых краязнаўчых баз даных.

# Асноўныя юбілейныя даты горада і раёна

## У 2017 г. спаўняецца …

***730 гадоў*** з часу першага ўпамінання Кобрына ў Іпацьеўскім летапісе *(1287 г.)*




***630 гадоў*** з пачатаку існавання дынастыі князей Кобрынскіх *(1387 г.)*

***260 гадоў*** з часу ўтварэння Кобрынскага ключа *(1757 г.)*

*Літоўскі падскарбі Ежы Флемінг спрабуе рэфармаваць гаспадарчую дзейнасць Кобрынскай эканоміі, аб'яднаўшы яе з Брэсцкай, а сёлы і войтаўствы зводзячы ў ключы.*



***205 гадоў*** з часу перамогі рускіх войск у вайне 1812 г. (Кобрынскі бой ***1812 г.***)

***1882 г.*** У Кобрыне з'явілася чыгуначная станцыя.

*Пачаўся рух на ўчастку чыгункі Пінск — Жабінка, якая пралягла і праз Кобрыншчыну.*

***Верасень 1987 г.***

Кобрын адсвяткаваў свой 700-гадовы юбілей.




***15 гадоў*** з часу выдання гісторыка-дакументальнай хронікі Кобрынскага раёна “Памяць” *(2002 г.)*

# Юбілейныя даты вёсак Кобрынскага раёна

**Аграгарадку "Буховіцкі"** *– 10 гадоў*
**Аграгарадку "Кіселявецкі"** *– 10 гадоў*
**Аграгарадку "Осаўскі"** *– 10 гадоў*
**Аграгарадку "Пескаўскі"** *– 10 гадоў*

## Авады – 270 гадоў

**Авады** (мясцовая назва Оводы), вёска ў Хідрынскім сельсавеце. У 1747 г. вёска ў Брэсцкім ваяводстве; у 1890 г. у Верхалескай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні Расійскай імперыі, 178 дзесяцін зямлі (*1 дзесяціна = 1,0925 га*). У 1897 г. 16 двароў, 116 жыхароў, хлебазапасны магазін. У 1905 г. 154 жыхары. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Навасёлкаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 4 двары, 22 жыхары. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Дзівінскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. да 30.10.1959 г. у Верхалескім сельсавеце, з 08.08.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г. 20 двароў, 77 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну Авады акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. На 01.01.1999 г. - 19 двароў, 36 жыхароў, у складзе калгаса «Зара» (з 2004 СВК "Узыходзячая зара"), 16 гаспадарак, 38 жыхароў (2005 г.). Колькасць насельніцтва в. Авады на 01.01.2014 г. складае 25 жыхароў.

**Авады** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 115.

**Авады** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 561. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Пянко, А**. Ехалі да сяла кум і кума : свята в. Авады / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2005. – 12 кастрычніка. – С. 3.

**Хільчук, М.** У Авадах скардзяцца толькі на старасць : Вясковыя рэаліі / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2001. – 31 ліпеня. – С. 2.

## Агароднікі – 420 гадоў

**Агароднікі** (мясцовая назва Огородныкы), вёска ў Батчынскім сельсавеце. Транспартныя сувязі па аўтадарозе Кобрын-Жабінка.

У 1597 г. сяло ў Патрыкоўскім войтаўстве Кобрынскага староства Брэсцкага ваяводства Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ). Сяло размяшчалася пры фальварку Чаравачыцы, налічвала 10 валок зямлі (*1 валока=21,36 га*), падзеленых па паўвалокі. Вяскоўцы выконвалі агародніцкую службу ў полі, а жанчыны - на агародах. З 1795 г. вёска ў складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце Слонімскай, з 1797 г. Літоўскай, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1897 г. 20 двароў, 178 жыхароў. У 1905 годзе - 193 жыхары. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Прускаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 22 двары, 126 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940

года ў Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Батчынскім сельсавеце. У 1940 г. хутары Агароднікі, 41 двор, 221 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну Агароднікі акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У 1949 г. арганізаваны калгас «Радзіма» (старшыня Ф. Я. Белюсь). На 01.01.1999 г. 15 двароў, 28 жыхароў, у складзе калгаса «Запаветы Ільіча» (з 2004 СВК "Батчы"). Колькасць насельніцтва в. Агароднікі на 01.01.2016 г. складае 16 жыхароў.

**Агароднікі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 115.

**Агароднікі** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 561. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Альхоўка – 120 гадоў

**Альхоўка** (мясцовая назва Ольхівка), вёска ў Навасёлкаўскім сельсавеце, за 26 км ад горада Кобрына, 62 км ад Брэста. Транспартныя сувязі па шашы Кобрын – Макраны. У 1897 г. вёска ў Верхалескай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні Расійскай імперыі, 19 двароў, 190 жыхароў, 368,5 дзесяціны зямлі (на 1890). У 1905 г. 238 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Навасёлкаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 12 двароў, 73 жыхары. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Дзівінскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Верхалескім сельсавеце, з 08.08.1959 г. у Кобрынскім раёне, з 30.10.1959 г. у Навасёлкаўскім сельсавеце. У 1940 г. 85 двароў, 155 жыхароў, пачатковая школа. У Вялікую Айчынную вайну Альхоўка акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У 1949 г. 40 вясковых гаспадарак аб'ядналіся ў калгас імя Калініна (старшыня П. І. Пшано). На 01.01.1999 г. 60 двароў, 145 жыхароў, магазін, у складзе калгаса імя Чкалава (з 2004 г. СВК "Верхалескі"). Колькасць насельніцтва в. Альхоўка на 01.01.2016 г. – 122 жыхары.

**Альхоўка** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 117.

**Альхоўка** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 562-563. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Тиборовская, Т.** "Первая ласточка"/ Т. Тиборовская // Рэспубліка. – 2002. – 29 мая. – С. 3. – ( В д. Ольховка открыт дом социальных услуг).

**Сацук, А**. А вёска жыве… / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 1994. – 17 верасня. – С. 3.

## Астраўляны – 120 гадоў

**Астраўляны** (мясцовая назва Островляны), вёска ў Хідрынскім сельсавеце, за 4 км ад горада Кобрына, 46 км ад Брэста. У 1897 г. вёска ў Прускаўскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні Расійскай імперыі, 22 двары, 133 жыхары, хлебазапасны магазін, майстэрня, 106 дзесяцін зямлі (разам з урочышчам Вялікі роў, на 1890). У 1905 г. 159 жыхароў і аднайменнае ўрочышча, 9 жыхароў. У 1921 г. у складзе Польшчы, у Прускаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 2 двары, 19 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Пескаўскім, з 16.07.1954 г. у Пецькаўскім, з 18.12.1972 г. у

Хідрынскім сельсаветах. У 1940 г. 25 двароў, 131 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У 1949 г. арганізаваны калгас імя Астроўскага. На 01.01.1999 г. 60 двароў, 163 жыхары, у складзе аграфірмы «Беларусь» (з 2004 г. - СВК "Вербнае"). Колькасць насельніцтва в. Альхоўка на 01.01.2016 – 373 жыхары.

**Астраўляны** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 119.

**Астраўляны** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 564. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Гарадзец – 875 гадоў

**Гарадзец** (мясцовая назва Городэць), вёска, цэнтр Гарадзецкага сельсавета. За 22 км ад Кобрына, 68 км ад Брэста; чыгуначная станцыя на лініі Брэст – Гомель.




Вядома з XII ст., згадваецца ў 1142 г., у час княжацкіх міжусобіц. У 1286 г. валынскі князь Уладзімір Васількавіч у духоўнай грамаце завяшчаў сваёй жонцы Вользе Раманаўне разам з г. Кобрынам і сяло Гарадзец. Пазней Гарадзец - горад у вотчынным уладанні князёў Кобрынскіх, з пачатку XVI ст. у ліку каралеўскіх «сталовых маёнткаў». У 1563 г. Гарадзец - горад і двор Кобрынскай эканоміі (з 1532), з 1566 г. у Брэсцкім ваяводстве ВКЛ. У горадзе існавалі рынак, 5 вуліц (Кобрынская, Прышыхоцкая, Пінская, Грушаўская, вуліца ўздоўж царквы), Ільінская царква (мела 2 вольныя валокі зямлі), звыш 193 гаспадарак (паводле даследаванняў Ю. А. Якімовіча, 205 двароў), прадмесце, агароды. У двары Гарадзецкім меліся агароды, 2 млыны, ахова. Воласць Гарадзецкага двара складалася з 2 войтаўстваў (даход ад воласці - 275 коп 11 грошаў). У 1589 г. каралева Ганна Ягелонка даравала гораду Магдэбургскае права без уласнага кіравання: Гарадзец па ўсіх справах падпарадкоўваўся Кобрынскаму магістрату. У 1597 г. у горадзе 60 валок зямлі, з якіх 57 былі «на плаце», 1 належала войту, 2 - царкве; меліся рынак, Ільінская царква, дом святара, агароды, млыны, 5 піўных і 1 мядовая карчма. На тэрыторыі двара свіран, дом чэлядзі, кухня, пякарня, стайні, гумно, стадола. У 1618 г. горад налічваў 222 пляцы, з якіх збіралася даходу 218 коп і 13 грошаў. У 1633 г. дзейнічаў Гарадзецкі касцёл, для якога паводле ліста каралеўскага рэвізора Я. Валовіча былі адмераны 15 «аселых» і 3 «пустыя» валокі зямлі ў сяле Грушава. У 1742 г. Ільінская уніяцкая царква карысталася 2 вольнымі валокамі зямлі, у 1789 г. пад царквою лічылася 13 «вольных» пляцаў. Пасля 1757 г. Гарадзец - мястэчка, цэнтр Гарадзецкага ключа (уваходзілі вёскі Асмаловічы, Вуглы, Грушава, Камень Каралеўскі, Худлін і Чалішчавічы). У 1784 г. апошні польскі кароль Станіслаў Аўгуст наведаў мястэчка па дарозе на Гродзенскі сейм. Адначасова кароль разам са світаю агледзеў пабудаваны Каралеўскі канал, праехаў па канале на спецыяльным боце 0,25 вярсты да другога шлюза. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У жніўні 1820 г. жыхары і сяляне мястэчка адмаўляліся выконваць павіннасці на карысць свайго ўладальніка. 24

жніўня ў Гарадзец прыбыў кобрынскі земскі спраўнік, была адпраўлена ваенная каманда ў 50 чалавек. У 1860 г. мястэчка, 149 двароў, прыстань, да 1866 г. дзейнічала каталіцкая парафія. У 1878 г. 1264 жыхары, паштовая станцыя; у 1876 г. у Гарадзец перавезена драўляная Свята-Вазнясенская царква з в. Камень-Шляхецкі (захавалася да нашага часу). У 1886 г. цэнтр Гарадзецкай воласці, 74 двары, 1331 жыхар, валасное праўленне, 2 царквы (у 1888 г. 2576 вернікаў), 2 сінагогі, школа, 4 крамы, 3 заезныя двары, 2 ветраныя млыны, піцейны дом. Каля мястэчка сыраварня, ветраны млын. У 1890 г. у мястэчку 822 дзесяціны зямлі. Маёнтак Гарадзец, уладанне П. Штэра, 5800 дзесяцін зямлі (разам з 4 фальваркамі). У 1897 г. мястэчка, каля гандлёвага шляху Кобрын-Пінск, Палескай чыгункі, Дняпроўска-Бугскага канала; 279 двароў, 275 жылых дамоў, 1691 жыхар, 2 царквы, 2 яўрэйскія малітоўныя дамы, сінагога, народнае вучылішча (у 1889/90 навучальным годзе было 82 хлопчыкі, 20 дзяўчынак, у 1892/93 г. 89 хлопчыкаў, 17 дзяўчынак; у 1905/06 г. 185 хлопчыкаў, 15 дзяўчынак), валасное праўленне, мяшчанская ўправа, пошта, хлебазапасны магазін, 14 крам, 4 ветраныя млыны, 4 кузні, цагельны завод, 3 піцейныя дамы. У дзень Святой Тройцы праводзіліся кірмашы. Побач з мястэчкам знаходзіліся аднайменныя: маёнтак (пры чыгунцы), 7 двароў, 51 жыхар; пасёлак (каля чыгуначнай станцыі), 6 жыхароў; дом і млын, 3 жыхары - уладанні П. П. Штэра. Пры Дняпроўска-Бугскім канале існавала плаціна № 1 з ахоўным домам 2-го ўчастка Брэсцка-Літоўскага аддзялення Ковенскай акругі, 8 жыхароў. У 1905 г. у мястэчку 2949 жыхароў, у маёнтку 22 жыхары, казённай плаціне - 7. З 1921 г. у складзе Польшчы, цэнтр гміны Кобрынскага павета Палескага ваяводства. Мястэчка і фальварак налічвалі 99 двароў, 688 жыхароў, чыгуначная станцыя Гарадзец — 10 двароў, 65 жыхароў. У 1931 г. Гарадзецкая гміна налічвала 418 км2, 58 населеных пунктаў, 9500 жыхароў. У 1932 г. у Гарадцы быў пабудаваны Народны дом (мелася зала са сцэнай), пажарнае дэпо, з 1928 г. дзейнічала бібліятэка (знаходзілася ў плябаніі), 611 кніг на польскай мове, 82 чытачы. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Антопальскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. цэнтр сельсавета, з 08.08.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г. мястэчка, 305 двароў, 1153 жыхары, 2 паравыя млыны, руская няпоўная сярэдняя школа, фельчарскі пункт, хата-чытальня, каапературыўная лаўка. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У Гарадзецкі сельсавет уваходзілі 34 населеныя пункты (578 двароў, 2410 жыхароў). На 01.01.1999 г. вёска, 574 двары, 1461 жыхар, будынкі выканкома сельсавета і адміністрацыі калгаса-камбіната імя Дзяржынскага (у 1977 г. каля будынка ўстаноўлены бюст Ф. Дзяржынскага), клуб, бальніца, кафэ, сярэдняя школа, дзіцячы сад, амбулаторыя, аптэка, бібліятэка, магазін. У 2008 г. в. Гарадзец змяніла статус і пераўтворана ў аграгарадок. Колькасць насельніцтва в. Гарадзец на 01.01.2016 г. – 1376 жыхароў.




Помнік архітэктуры - Свята-Вазнясенская царква (1799 г.).

Помнік на брацкай магіле 20 воінаў 12-й гвардзейскай стралковай дывізіі, ён ушаноўвае таксама памяць 78 землякоў, якія загінулі ў барацьбе з гітлераўцамі ў 1941-1945 гг.

**Гарадзец** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. / рэд. кал.: П. У. Броўка [і інш.]. – Мінск, 1971. – Т. 3. – С. 346.

**Гарадзец** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 1997. – Т. 5. – С. 39.

**Гарадзец** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 133-135.

**Гарадзец** // Культура Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск, 2012. – Т. 2. – С. 507.

**Гарадзец** // Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Мінск, 2004. – Т. 3. – С. 125.

**Гарадзец** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 572-574. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Городец** // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 287.

**“Гарадзецкі** гасцінец” : газета ў газеце // Кобрынскі веснік. – 2016. – 16 лістапада. – С. 4.

**Пашкович, Л.** Городцу – 870 лет / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. – 2012. – 25 жніўня. – С. 2.

**Жук, Е.** Мотивация по-городецки / Елена Жук // Вечерний Брест. – 2010. – 16 июля. – С. 6. - Из истории Городца.

**Сацук, А.** Современный имидж древнего Городца / А. Сацук, А. Пянко, А. Шугай // Кобрынскі веснік. – 2009. – 21 студзеня. – С. 1, 3.

**Сацук, А.** Городецкие реалии / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 2008. – 15 лістапада. – С. 1, 2.

Городец меняет статус и преобразовывается в агрогородок.

## Гірск – 120 гадоў

**Гірск**, вёска ў Кіселявецкім сельсавеце.У 1897 г. вёска ў Блоцкай (Балоцкай) воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні Расійскай імперыі, 80 двароў, 579 жыхароў, кузня, 2 крамы, 719 дзесяцін зямлі (на 1890). Побач з вёскай праходзіў гандлёвы шлях Гарадзец - Навасёлкі. У 1905 г. 484 жыхары. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Блоцкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства; 68 двароў, 468 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Антопальскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. да 31.03.1959 г. у Акцябрскім сельсавеце, з 08.08.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г. 798 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У 1947 г. працавала пачатковая школа. У 1950 г. 42 вясковыя гаспадаркі аб’ядналіся ў калгас імя Катоўскага. На 01.01.1999 г. 138 двароў, 253 жыхары, магазін, у складзе калгаса «Усход». Колькасць насельніцтва в. Гірск на 01.01.2016 г. – 131 жыхар.

Помнік на магіле 32 партызан атрада імя Катоўскага, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі ў 1942-1944 гг.

**Гірск** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 136.

**Гірск** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 574-575. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Волосевич, С.** Здесь каждый уголок сердцу мил / С. Волосевич // Кобрынскі веснік. – 2006. – 19 ліпеня. – С. 2.

## Гуцкі – 280 гадоў

**Гуцкі**, вёска ў Батчынскім сельсавеце, за 9 км ад Кобрына, 50 км ад Брэста. Аўтадарогамі звязана з Жабінкай, Кобрынам, Каменцам. Упершыню ўпамінаецца ў 1737 годзе. У 1890 г. вёска ў Стрыгаўскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні Расійскай імперыі, 156 дзесяцін зямлі. Побач знаходзіўся аднайменны маёнтак, уладанне А. Біча, 92 дзесяціны зямлі. У 1897 г. у вёсцы 17 двароў, 166 жыхароў, хлебазапасны магазін, у маёнтку 12 жыхароў. У 1905 г. у вёсцы 197 жыхароў, у маёнтку 27. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Стрыгаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска і фальварак, 25 двароў, 151 жыхар. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Батчынскім сельсавеце. У 1940 г. хутары, 45 двароў, 170 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У 1950 г. арганізаваны калгас імя Малянкова (32 гаспадаркі). На 01.01.1999 г. 3 двары, 3 жыхары, у складзе калгаса «Патрыкі», 1 гаспадарка, 1 жыхар (2005 г.).

**Гуцкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 138.

**Гуцкі** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 576. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Кузина, С.** Деревня моя, деревянная, давняя… / Светлана Кузина // Кобрин-информ. – 2016. – 5 мая. – С. 5.

Уроженец д. Гуцки Л. И. Жук рассказывает историю деревни и своего рода.

**Хільчук, М.** У вёскі лёс горкі / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2002. – 16 сакавіка. – С. 2.

## Забава - 120 гадоў

**Забава,** вёска ў Навасёлкаўскім сельсавеце, за 19 км ад Кобрына, 64 км ад Брэста, на шашы Кобрын – Макраны. У 1897 г. маёнтак, уладанне А. Юшкевіч, у Верхалескай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні Расійскай імперыі, 1001 дзесяціна зямлі (1890), 6 двароў, 51 жыхар. У 1905 г. пасёлак, 47 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Навасёлкаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 3 двары, 22 жыхары. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Дзвінскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Верхалескім сельсавеце, з 08.08.1959 г. у Кобрынскім раёне, з 30.10.1959 г. у Навасёлкаўскім сельсавеце. У 1940 г. вёска, 16 двароў, 84 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У сакавіку 1948 г. у вёсцы пачалося будаўніцтва першага ў Дзівінскім раёне цагельнага завода. На 01.01.1999 г.

12 двароў, 22 жыхары, у складзе калгаса імя Чкалава (з 2004 г. – у СВК "Верхалескім"), 11 гаспадарак, 16 жыхароў (2005 г.).

**Забава** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 143-144.

**Забава** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 579-580. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Завужоўе – 420 гадоў

**Завужоўе** (мясцовая назва Заужіўе), вёска ў Тэвельскім сельсавеце, за 18 км ад Кобрына, 6 км ад чыгуначнай станцыі Тэўлі, 64 км ад Брэста. Назва сучаснай вёскі паходзіць ад р. Ужавая, якая ўпамінаецца ў 1563 г. У 1597 г. сяло ў Залескім войтаўстве Кобрынскага староства ВКЛ, 13 валок зямлі. Пры сяле меўся засценак, 10 валок зямлі. У 1742 г. сяло, 14 валок зямлі, у Чаравачыцкім ключы Брэсцкай эканоміі. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. вёска ў Казішчанскай воласці, 538,5 дзесяціны зямлі (разам з сядзібай Германы). У 1897 г. 25 двароў, 201 жыхар. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Стрыгаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 14 дамоў, 79 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Казішчанскім, з 11.08.1959 г. у Тэвельскім сельсавеце. У 1940 г. 35 двароў, 222 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. Паводле перапісу 1959 г. у вёсцы 227 жыхароў, у 1970 - 176. На 01.01.1999 г. 42 двары, 103 жыхары, у складзе калгаса імя Гагарына (з 2004 г. СВК "Тэўлі"). Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2016 г. – 35 жыхароў.

У в. Завужоўе нарадзіўся доктар філасофскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт Акадэміі наук СССР М. Т. Іаўчук.

**Завужоўе** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 145.

**Завужоўе** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 580. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Закалнечча – 120 гадоў

**Закалнечча** (мясцовая назва Закалынэччэ), вёска ў Кіселявецкім сельсавеце, за 14 км ад Кобрына, 59 км ад Брэста. У 1897 г. фальварак, 9 жыхароў, уладанне А. Гана, у Блоцкай (Балоцкай) воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні Расійскай імперыі. У 1905 г. 10 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Блоцкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, калонія, 20 дамоў, 152 жыхары. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Кісялевіцкім сельсавеце. У 1940 г. на хутары Закалнечча 65 двароў, 254 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У 1959 г. вёска, 126 жыхароў. У 1970 г. хутар, 20 жыхароў, у складзе калгаса "Новы шлях" (з 2004 г. "Магдалінскі"). У сучасны перыяд вёска не заселена.

**Закалнечча** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 145.

**Закалнечча** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 580-581. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Калюхі – 230 гадоў

**Калюхі** (мясцовая назва Колюхы), вёска ў Кісялевіцкім сельсавеце, за 14 км ад Кобрына, 59 км ад Брэста. У 1787 г. маёнтак у Брэсцкім ваяводстве ВКЛ. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1897 г. вёска, у Блоцкай (Балоцкай) воласці, 19 двароў, 170 жыхароў, хлебазапасны магазін, 565,25 дзесяціны зямлі (разам з в. Арлы, 1890). У 1905 г. 250 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Блоцкай гміне Кобрынскага павета, вёска, 8 дамоў, 50 жыхароў, і фальварак, 2 двары, 26 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Кісялевіцкім сельсавеце. У 1940 г. хутары, 28 двароў, 140 жыхароў; былы фальварак, 14 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У 1950 г. у вёсцы арганізаваны калгас «Сталінскі шлях». Паводле перапісу 1959 г. у вёсцы 117 жыхароў, у 1970 – 93 жыхары. На 01.01.1999 г. 20 двароў, 47 жыхароў, у складзе калгаса «Світанне» (з 2004 ААТ "Кісялёўцы"). Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2016 г. – 18 жыхароў.

**Калюхі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 152.

**Калюхі** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 585. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Лука – 120 гадоў

**Лука,** вёска ў Астроміцкім сельсавеце, цэнтр племзавода «Дружба», за 28 км ад Кобрына, 72 км ад Брэста. У 1897 г. Лука - вёска ў Іласкай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні Расійскай імперыі, 28 двароў, 229 жыхароў, кузня. Побач знаходзіліся аднайменныя: выселак (пры Маскоўска-Брэсцкай шашы), 6 жыхароў, і лясная ахова, 5 жыхароў. У 1905 г. у вёсцы 200 жыхароў, у выселку 9 жыхароў, у ахове 7 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Іласкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 29 двароў, 146 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Антопальскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. да 16.07.1954 г. у Іласкім сельсавеце, з 08.08.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г. - 366 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У 1949 г. у вёсцы арганізаваны калгас імя К. Маркса. Паводле перапісу 1959 г. у вёсцы 223 жыхары, у 1970 – 213 жыхароў. На 01.01.1999 г. 228 двароў, 721 жыхар, магазін, Дом культуры, бібліятэка, амбулаторыя, дзіцячы сад, сярэдняя школа. У 2009 г. в. Лука набыла стастус аграгарадка. Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2016 г. – 593 жыхары.

Мемарыяльны комплекс на ўшанаванне памяці мірных жыхароў, расстраляных гітлераўцамі ў 1944 г., і загінуўшых на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

**Лука** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. / рэд. кал.: П. У. Броўка [і інш.]. – Мінск, 1972. – Т. 6. – С. 433.

**Лука** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 161.

**Лука** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 591. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Хільчук, М.** Лукскія ўражанні : Тут супакоіцца душа / Марыя Хільчук // Камуністычная праца. – 1990. – 24 сакавіка.

## Мазуры – 120 гадоў

**Мазуры**, вёска ў Хідрынскім сельсавеце, за 3 км ад Кобрына, 42 км ад Брэста. Каля шашы Мінск – Брэст. У 1897 г. у Прускаўскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні, вёска, 22 двары, 148 жыхароў, 116 дзесяцін зямлі (1890), хлебазапасны магазін. У 1905 г. 173 жыхары. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Прускаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 16 двароў, 118 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Пескаўскім, з 16.07.1954 г. у Пецькаўскім, з 18.12.1972 г. у Хідрынскім сельсаветах. У 1940 г. 34 двары, 190 жыхароў, працавала пачатковая школа. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У 1949 г. арганізаваны калгас імя А. Неўскага. Паводле перапісу 1959 г. у вёсцы 150 жыхароў, у 1970 г. – 224 жыхары. На 01.01.1999 г. 86 двароў, 283 жыхары, пачатковая школа, у складзе аграфірмы «Беларусь» (з 2004 СВК "Вербнае"). Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2016 г. – 25 жыхароў.

**Мазуры** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 166.

**Мазуры** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 593-594. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Максимчик, А.** Плоды общих усилий / А. Максимчик // Кобрынскі веснік. – 2005. – 20 красавіка. – С. 1. – В деревни Мазури и Забужки пришёл природный газ.

**Славин, В.** Ещё две деревни с газом / В. Славин // Заря. – 2005. – 16 апреля. – С. 1.

Жители деревень Мазури и Забужки Кобринского района получили долгожданный природный газ.

## Малышы – 300 гадоў

**Малышы**, вёска ў Тэвельскім сельсавеце, за 12 км ад Кобрына, 8 км ад чыгуначнай станцыі Тэўлі, 63 км ад Брэста. У 1717 г. сяло ў Брэсцкім ваяводстве ВКЛ. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. вёска ў Стрыгаўскай воласці, 325,5 дзесяціны зямлі, маёнткі, уладанні А. Краскоўскага, 43 дзесяціны зямлі, і М. Маслевіча, 142 дзесяціны зямлі. У 1897 г. у вёсцы (4 вярсты ад Маскоўска-Брэсцкай чыгункі) 36 двароў, 242 жыхары, хлебазапасны магазін, у маёнтках 15 і 7 жыхароў. У 1905 г. у вёсцы 269 жыхароў, у маёнтках 26 і 11 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Стрыгаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 39 двароў, 229

жыхароў, фальварак, 7 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Стрыгаўскім, з 11.08.1959 г. у Тэвельскім сельсаветах. У 1940 г. вёска, 57 двароў, 256 жыхароў, былы фальварак, 3 двары, 30 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У 1949 г. арганізаваны калгас «Светлы шлях» (старшыня П. Сюсюра). Паводле перапісу 1959 г. у вёсцы 257 жыхароў, у 1970 г. – 196. На 01.01.1999 г. 42 двары, 83 жыхары, у складзе калгаса імя Дзімітрова (з 2004 г. ААТ "Стрыгава"). Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2016 г. – 39 жыхароў.

**Малышы** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 166-167.

**Малышы** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 594. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Данілюк, Ю.** Малышоўскі прывід у вясельнай сукенцы / Юлія Данілюк // Кобрынскі веснік. – 2013. – 16 лістапада. – С. 4.

Легенда пра в. Малышы.

**Пятроўская, М.** І ў маленькіх вёсках не сумуюць / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2004. – 2 ліпеня. – С. 7.

## Мухаўлокі – 290 гадоў

**Мухаўлокі** (мясцовая назва Муховлокы), вёска ў Астроміцкім сельсавеце, за 13 км ад Кобрына, 59 км ад Брэста. Транспартныя сувязі па шашы Брэст – Баранавічы. У 1727 г. маёнтак у Брэсцкім ваяводстве ВКЛ. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. у Падалескай воласці, вёска, 320,5 дзесяціны зямлі, і маёнтак, 409 дзесяцін зямлі (уладанне М. Матноўскай). У 1897 г. у вёсцы 35 двароў, 228 жыхароў, хлебазапасны магазін, у маёнтку 6 жыхароў. У 1905 г. у вёсцы 285 жыхароў, у маёнтку 9 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Падалескай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска і асада 16 двароў, 80 жыхароў. У 1930-я гады працавала школа. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Жухавецкім, з 16.07.1954 г. у Астроміцкім сельсаветах. У 1940 г. хутары, 33 двары, 177 жыхароў, фальварак, 1 двор, 14 жыхароў, працавала пачатковая школа (пасля 1945 г. школа-сямігодка). У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. Паводле перапісу 1959 г. у вёсцы 212 жыхароў, у 1970 г. – 206 жыхароў. На 01.01.1999 г. 38 двароў, 65 жыхароў, магазін, у складзе калгаса імя Мічурына. Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2016 г. – 29 жыхароў.

Помнік на ўшанаванне памяці 12 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

**Мухаўлокі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 168-169.

**Мухаўлокі** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 595. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Максімчык, А.** Весяліліся – спявалі, вяскоўцаў шанавалі / Аляксей Максімчык // Кобрынскі веснік. – 2007. – 11 жніўня. – С. 2.

Вёска Мухаўлокі адзначыла 280-годдзе.

## Навасёлкі – 120 гадоў

**Навасёлкі** (мясцовая назва Новосілкы), вёска ў Астроміцкім сельсавеце, за 28 км ад Кобрына, 72 км ад Брэста. У 1897 г. у Іласкай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні, вёска, 27 двароў, 174 жыхары, хлебазапасны магазін, 287,2 дзесяціны зямлі (1890). У 1905 г. 175 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Іласкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 19 двароў, 89 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Антопальскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. да 16.07.1954 г. у Іласкім сельсавеце. У 1940 г. 159 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну, у 1943 г., нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску (32 двары) і расстралялі 67 вяскоўцаў. Пасля вайны вёска адноўлена. У 1949 г. арганізаваны калгас імя Кутузава. Паводле перапісу 1959 г. у вёсцы налічвалі 51 жыхара, у 1970 г. – 97 жыхароў. На 01.01.1999 г. 18 двароў, 45 жыхароў, у складзе калгаса «Праўда» (з 2004 г. СВК “Шамятоўка”); 14 гаспадарак, 26 жыхароў (2005 г.). Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2014 г. – 16 жыхароў.

Помнік на ўшанаванне памяці ахвяр фашызму.

**Навасёлкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 170.

**Навасёлкі** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 596. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Нятрэба – 120 гадоў

**Нятрэба** (мясцовая назва Нэтрэба), вёска ў Гарадзецкім сельсавеце, за 15 км ад Кобрына, 59 км ад Брэста. У 1897 г. у Блоцкай (Балоцкай) воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні, маёнтак, 7 жыхароў. У 1907 г. 7 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Гарадзецкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска Нятрэба-Рачкі, 8 двароў, 50 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Антопальскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Акцябрскім, з 31.03.1959 г. у Гарадзецкім сельсаветах, з 08.08.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г. 74 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. Паводле перапісу 1959 г. у вёсцы налічвалі 53 жыхары, у 1970 г. – 38 жыхароў. На 01.01.1999 г. 5 двароў, 7 жыхароў, у складзе калгаса «Кастрычнік», у 2005 г. – 2 гаспадаркі, 2 жыхары. Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2014 г. – 1 жыхар.

**Нятрэба** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 172.

**Нятрэба** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 597. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Пералессе - 120 гадоў

**Пералессе** (мясцовая назва Пэрэліссе), вёска ў Осаўскім, цяпер Дзівінскім сельсавеце. У 1897 г. – пасёлак у Макранскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні, пасёлак, 2 двары, 10 жыхароў. Побач праходзіў гандлёвы шлях Дзівін - Макраны і знаходзілася казённая лясная дача. У 1905 г. урочышча Перавессе, 10 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Дзівінскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Дзівінскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Осаўскім сельсавеце, з 08.08.1959 г. у Маларыцкім, з 25.12.1962 г. у Кобрынскім раёнах. У 1940 г. хутары Перавессе, 32 двары, 177 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. Паводле перапісу 1959 г. у хутары Перавессе налічвалі 96 жыхароў, у 1970 г. вёска той жа назвы – 55 жыхароў. На 01.01.1999 г. вёска Пералессе - 27 двароў, 61 жыхар, у складзе калгаса «Дружба народаў», у 2005 г. – 20 гаспадарак, 46 жыхароў. Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2014 г. – 20 жыхароў.

6 магіл мясцовых жыхароў і савецкага воіна, расстраляных фашыстамі ў 1942 годзе.

**Пералессе** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 177.

**Пералессе** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 600-601. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Плашчыны – 120 гадоў

**Плашчыны** (мясцовая назва Плошчыны), вёска ў Буховіцкім сельсавеце. За 22 км ад Кобрына, 66 км ад Брэста. У 1897 г. у Казішчанскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні, вёска, 12 двароў, 94 жыхары, 60 дзесяцін зямлі (1890). У 1905 г. 98 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Падалескай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 19 дамоў, 86 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Засімскім, з 16.07.1954 г. у Яроміцкім, з 19.07.1976 г. у Буховіцкім сельсаветах. У 1940 г. 17 двароў, 99 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. Паводле перапісу 1959 г. Плашчыны хутары, 47 жыхароў, у 1970 г. – вёска, 40 жыхароў. На 01.01.1999 г. - 1 двор, 1 жыхар.

**Плашчыны** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 179.

**Плашчыны** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 602. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Птушкафабрыка, пасёлак - 55 гадоў

**Птушкафабрыка, пасёлак** у Батчынскім сельсавеце. Заснаваны ў 1962 г. разам з птушкафабрыкай. За 2 км ад Кобрына, 55 км ад Брэста. На 01.01.1999 г. 202 двары, 707 жыхароў, птушкафабрыка Кобрынскага рэспубліканскага аб'яднання

«Белптушкапром», дзіцячы сад, клуб, бібліятэка. У 2005 г. – 216 гаспадарак, 669 жыхароў. Колькасць насельніцтва птушкафабрыкі на 01.01.2016 г. – 715 жыхароў.

**Птушкафабрыка, пасёлак** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 181.

**Птушкафабрыка, пасёлак** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 603. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Рыбна – 120 гадоў

**Рыбна**, вёска ў Кіселявецкім сельсавеце, за 11 км ад Кобрына, 56 км ад Брэста. У 1897 г. у Блоцкай (Балоцкай) воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні, вёска, 57 двароў, 372 жыхары, 475,5 дзесяціны зямлі (1890), хлебазапасны магазін, 2 ветраныя млыны. У 1905 г. 444 жыхары. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Блоцкай (Балоцкай) гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, 41 двор, 272 жыхары. У 1930-я гады ў вёсцы працавалі школа і чытальня. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Кісялевіцкім сельсавеце. У 1940 г. хутары, 120 двароў, 534 жыхары, і пасёлак, 15 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У 1949 г. 36 вясковых гаспадарак аб’ядналіся ў калгас «Світанне» (старшыня Б. В. Дрык). Паводле перапісу 1959 г. у в. Рыбна 540 жыхароў, у 1970 г. – 390 жыхароў. На 01.01.1999 г. 122 двары, 332 жыхары, у складзе калгаса «Світанне». Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2016 г. – 352 жыхары.

**Рыбна** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 182.

**Рыбна** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 604. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Стасюкі – 275 гадоў

**Стасюкі** (мясцовая назва Стасюкы), вёска ў Тэвельскім сельсавеце, за 20 км ад Кобрына, 8 км ад чыгуначнай станцыі Тэўлі, 66 км ад Брэста. У 1742 г. у Чаравачыцкім ключы Брэсцкай эканоміі ВКЛ, сяло, 47 маргоў зямлі. У 1786 г. 3 валокі 38 маргоў зямлі. У 1795 г. вёска Кобрынскай эканоміі, 2 двары, 14 жыхароў. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. вёска ў Казішчанскай воласці, 681 дзесяціна зямлі. У 1897 г. 39 двароў, 340 жыхароў, хлебазапасны магазін, кузня, ветраны млын. У 1905 г. 321 жыхар. У 1921 г. у складзе Польшчы, у Стрыгаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 24 двары, 145 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Казішчанскім, з 11.08.1959 г. у Тэвельскім сельсаветах. У 1940 г. 50 двароў, 248 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. Паводле перапісу 1959 г. у в. Стасюкі 206 жыхароў, у 1970 г. – 156 жыхароў. На 01.01.1999 г. 35 двароў, 63 жыхары, у складзе калгаса імя Гагарына. Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2016 г. – 18 жыхароў.

**Стасюкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 185.

**Стасюкі** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 607. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Турная – 380 гадоў

**Турная**, вёска ў Залескім сельсавеце, за 11 км ад Кобрына, 57 км ад Брэста. У 1637 г. Турная (Турны, ці Млынары), у Брэсцкім ваяводстве, маёнтак, 20 маргоў зямлі. У 1786 г. у маёнтку 47 маргоў зямлі. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. у Залескай воласці, вёска, 498 дзесяцін зямлі, маёнтак, уладанне Н. Сабанскай, 609 дзесяцін зямлі, пасёлак, 45,5 дзесяціны зямлі (розныя ўладальнікі). У 1897 г. вёска, 84 двары, 566 жыхароў, хлебазапасны магазін, мыза Турна, 8 жыхароў, і дом для паромнай пераправы Турная (Замлыны) пры р. Мухавец, 16 жыхароў. У 1905 г. у вёсцы 571 жыхар, у маёнтку 15 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Прускаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 20 двароў, 143 жыхары. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Закросніцкім, з 16.07.1954 г. у Залескім сельсаветах. У 1940 г. 99 двароў, 417 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы з восені 1941 г. да красавіка 1944 г. дзейнічалі антыфашысцкі камітэт і з 12.08.1943 г. да сярэдзіны ліпеня 1944 г. падпольная камсамольская арганізацыя (у канцы 1943 г. - 17 членаў). У баях з гітлераўцамі ў раёне вёскі ў 1943-1944 гг. загінулі партызаны атрадаў імя А. В. Суворава і І. І. Арлова (партызанская брыгада імя В. І. Чапаева). У 1948 г. арганізаваны калгас імя Калініна (70 гаспадарак, старшыня С. М. Лукашук). Паводле перапісу 1959 г. 294 жыхары, у 1970 г. – 206 жыхароў. На 01.01.1999 г. - 47 двароў, 92 жыхары, магазін, тэрыторыя Брэсцкай абласной сортавыпрабавальнай станцыі. Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2016 г. – 33 жыхары.

Помнікі: у гонар падпольшчыкаў, і на брацкай магіле партызан, які ўшаноўвае таксама памяць 42 жыхароў вёсак Закросніца, Прылукі, Рачкі, Турная, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Мемарыяльная дошка падпольшчыкам на доме Ц. М. Краўчука, аднаго з кіраўнікоў падполля. У в. Турная нарадзіўся Д. С. Барысюк, удзельнік падпольнай барацьбы супраць акупацыі Польшчай Заходняй Беларусі і камандзір Турнянскага антыфашысцкага камітэта ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**Турная** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 188-189.

**Турная** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 609. – (З гісторыі населеных пунктаў).

## Хадынічы - 450 гадоў

**Хадынічы** (мясцовая назва Ходынычы), вёска ў Навасёлкаўскім сельсавеце, за 23 км ад Кобрына, 60 км ад Брэста. У 1567 г. у Брэсцкім павеце ВКЛ, маёнтак, уладанне Р. і М. Кульневічаў (у 1565 г. С. і Д. Кульневічаў). Пазней К. Хадыніцкі завяшчаў маёмасць Лепясоўскаму праваслаўнаму манастыру. У 1667 г. С. Табенскі на чале свайго атрада здзейсніў набег на маёнтак, але быў паранены манахамі і памёр. Брэсцкі падсудак Праздзецкі апраўдаў манахаў, аднак у хуткім часе сам

таксама разрабаваў маёнтак. Пасля хадайніцтва Кляменція Трызны, архімандрыта Віленскага Свята-Духаўскага манастыра, быў атрыманы каралеўскі ліст з загадам Праздзецкаму і Табенскім вярнуць маёмасць манахам. Галоўны Літоўскі трыбунал вырашыў справу на карысць манастыра (1679). З 1691 г. да 1740 г. маёнтак знаходзіўся ва ўладанні лепясоўскіх базыльян. Пазней зноў узніклі спрэчкі за маёмасць паміж манахамі і панамі Слаўкамі і Пухальскімі. Суд вырашыў справу на карысць апошніх. З 1795 г. у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1890 г. у Верхалескай воласці, вёска, 1774 дзесяціны зямлі, пасёлак, 179,5 дзесяціны зямлі, і 2 маёнткі, уладанне С. Мар'яновіча (399,5 дзесяціны зямлі) і А. Любімава (186 дзесяцін зямлі). У 1897 г. у вёсцы 40 двароў, 274 жыхары, царква на могілках, хлебазапасны магазін, у ваколіцы 15 двароў, 76 жыхароў, у маёнтках Хадынічы-Шаўчука 8 жыхароў, Хадынічы-Мар'яновіча 10 жыхароў, Хадынічы-Маціюка 14 жыхароў, ветраны млын. У 1905 г. вёска, 302 жыхары, маёнтак, 10 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Навасёлкаўкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 59 двароў, 308 жыхароў, і 2 фальваркі, 3 двары, 26 жыхароў. У 1930-я гады працавала школа. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Дзівінскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Верхалескім, з 30.10.1959 г. у Навасёлкаўскім сельсаветах, з 08.08.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г. 95 двароў, 489 жыхароў, працавала пачатковая школа. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. У 1949 г. 17 гаспадарак аб'ядналіся ў калгас «Перамога» (старшыня У. П. Мікалаюк). Паводле перапісу 1959 г. у вёсцы 352 жыхары, у 1970 г. – 356 жыхароў. На 01.01.1999 г. 115 двароў, 258 жыхароў, магазін, клуб, бібліятэка, у складзе калгаса імя Чкалава (з 2004 г. СВК "Верхалескі"). Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2016 г. – 139 жыхароў.

У в. Хадынічы нарадзіліся беларускі мастак І. В. Андрасюк, беларускі лінгвіст, педагог В. І. Іўчанкаў.

**Хадынічы** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 191-192.

**Хадынічы** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 611. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Пашковіч, Л.** Свята ў Хадынічах / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. – 2013. – 31 жніўня. – С. 12.

## Чаравачыцы - 600 гадоў

**Чаравачыцы** (мясцовая назва Чырыватычы), вёска ў Батчынскім сельсавеце, за 8 км ад Кобрына, 45 км ад Брэста. У 1417 г. упамінаецца царква Параскевы Пятніцы ў в. Чаравачыцы. Вядомы з XV ст. у Кобрынскім княстве ВКЛ як уладанне князёў Кобрынскіх. У 1454 г. вотчынны маёнтак князя Сямёна Раманавіча. Княгіня Ульяна (жонка князя) завяшчала свой палац Чаравачыцы і сяло Грушава з сялянамі дачцэ Ганне (жонка Ф. У. Бельскага). 22.08.1495 г. вялікі князь літоўскі Аляксандр сваім лістом пацвердзіў князёўне гэта ўладанне. З 1532 г. у Кобрынскай эканоміі, уладанне каралевы Боны. У 1563 г. цэнтр Чаравачыцкай воласці Патрыкаўскага войтаўства Кобрынскай эканоміі. Дзейнічалі Пятніцкая царква, працавалі 2 млыны, налічвалася 20 агароднікаў (яны мелі па 13 маргоў зямлі), 15 гаспадарак дворных. У 1724 г. Чаравачыцы - цэнтр аднайменнага ключа ў Кобрынскай эканоміі. З 1795 г. у

складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 г. Гродзенскай губерні. У 1886 г. у Прускай воласці, вёска, 1 двор, 8 жыхароў, валаснoe праўленне. За 0,5 вярсты знаходзіліся 2 царквы, праваслаўная капліца, школа. У 1888 г. Чаравачыцкі праваслаўны прыход налічваў 3228 вернікаў. У 1890 г. сядзіба Бендзюгі-Чаравачыцы, 499,2 дзесяціны зямлі; сяло Чаравачыцы - 74,5 дзесяціны зямлі, маёнтак Чаравачыцы, уладанне Г. Смарагдавай, 93,5 дзесяціны зямлі (разам з маёнткам Ангоціна, 11 жыхароў у 1897 г.). У 1897 г. сяло, 5 двароў, 43 жыхары, царква, народнае вучылішча, царква на могілках, піцейны дом; 1-я Бендзюга Чаравачыцы - сядзіба Р. Кодла, 7 двароў; 2-я Бендзюга Чаравачыцы - сядзіба Р. Глінскага, 13 жыхароў; 3-я Чаравачыцы Пад-Бендзюгі, сядзіба Прускаўскага валаснога праўлення, 8 жыхароў; 4-я Чаравачыцы - старожка пры пераправе цераз р. Мухавец, 1 жыхар. У Чаравачыцкім народным вучылішчы ў 1889/90 навучальным годзе вучыліся 64 хлопчыкі, 4 дзяўчынкі, у 1892/93 г. - 64 хлопчыкі, 10 дзяўчынак; у 1905/06 г. - 40 хлопчыкаў, 13 дзяўчынак. У 1905 г. сяло, 30 жыхароў, і маёнтак, 12 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Прускаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 6 двароў, 36 жыхароў, фальварак, 12 жыхароў. У 1930-я гады працавалі школа і вячэрнія курсы. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Батчынскім сельсавеце. У 1940 г. хутары, 12 двароў, 70 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну, у 1943 г., нямецкія карнікі расстралялі 56 вяскоўцаў, а вёску (18 двароў) спалілі. Пасля вайны вёска адноўлена. На ўшанаванне памяці ахвяр фашызму ў 1975 г. устаноўлены помнік. Паводле перапісу 1959 г. Чаравачыцы налічвалі 64 жыхары, у 1970 г. – 90 жыхароў. На 01.01.1999 г. 27 двароў, 67 жыхароў, у складзе калгаса «Запаветы Ільіча» (з 2004 г. СВК “Батчы”). Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2016 г. – 47 жыхароў.

**Чаравачыцы** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобл. - С. 194-195.

**Чаравачыцы** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 613. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Марчук, Н.** Вёска Чаравачыцы, царква і яе святары / Ніна Марчук // Краязнаўчая газета. – 2010. - № 13. – С. 7.

**Астапчук, Ю.** Чаравачыцы / Ю. Астапчук // Народная трыбуна. – 2004. – 10 студзеня. – С. 4.

## Шуры – 120 гадоў

**Шуры**, вёска ў Гарадзецкім сельсавеце. У 1897 г. у Іласкай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні, вёска, 11 двароў, 71 жыхар, 77 дзесяцін зямлі (1890). У 1905 г. 69 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Іласкай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 6 двароў, 19 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Антопальскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Дзямідаўшчынскім, з 16.07.1954 г. у Грушаўскім, з 21.01.1961 г. у Гарадзецкім сельсаветах, з 08.08.1959 г. у Кобрынскім раёне. У 1940 г. 66 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. Паводле перапісу 1959 г. Шуры – хутары, 55 жыхароў, у 1970г. – вёска, 48 жыхароў. На 01.01.1999 г. 9 двароў, 11 жыхароў, у складзе калгаса-

камбіната імя Дзяржынскага. Колькасць насельніцтва вёскі на 01.01.2016 г. – 3 жыхары.

**Шуры** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 196.
**Шуры** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 613-614. – (З гісторыі населеных пунктаў).
**Хільчук, М.** "Ёсць у нас і такая вёска…" / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2004. – 27 лістапада. – С. 3. – Некалькі згадак пра гісторыю в. Шуры.

## Яўсімавічы – 310 гадоў

**Яўсімавічы** (мясцовая назва Еўсымовычы), вёска ў Буховіцкім сельсавеце. Упамінаюцца ў 1707 годзе. У 1897 г. у Падалескай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні, вёска, 58 двароў, 393 жыхары, хлебазапасны магазін, кузня, 380 дзесяцін зямлі (1890), побач знаходзіліся ваколіца Яўсімавічы і Жукаўцы, 204 дзесяціны. У 1905 г. 447 жыхароў. З 1921 г. у складзе Польшчы, у Падалескай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства, вёска, 36 двароў, 187 жыхароў. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з 12.10.1940 г. у Яроміцкім, з 19.07.1976 г. у Буховіцкім сельсаветах. У 1940 г. 63 двары, 298 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня 1941 да ліпеня 1944 г. Паводле перапісу 1959 г. 290 жыхароў, у 1970 г. – 275 жыхароў. На 01.01.1999 г. 93 двары, 245 жыхароў, у складзе калгаса «Звязда» (з 2004 г. СВК "Мінянскі"), на 01.01.2016 г. - 240 жыхароў.

**Яўсімавічы** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 198.
**Яўсімавічы** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 615. – (З гісторыі населеных пунктаў).

# Юбілейныя даты храмаў Кобрыншчыны

## Свята-Пакроўская царква в. Акцябр *(1937 г.)*- 80 гадоў



**Свята-Пакроўская царква** ў в. Акцябр знаходзіцца на ўскраіне вёскі. Пабудавана ў 1937 г. Развітую і шматпланавую аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю храма складаюць цэнтрычна-крыжовы зруб малітоўнай залы, 5-гранная апсіда з партатыўнымі бакавымі рызніцамі, далучаны праз трапезную прытвор-званіца. Званіца вырашана высокім шатровым васьмерыком і разам з 8-гранным шатровым барабанам з макаўкай над цэнтральным аб'ёмам дамінуе ў сілуэце храма. Грані-прыдзелы асноўнага зруба і бабінца завершаны 3-вугольнымі франтонамі. Гарызантальна ашаляваныя сцены прарэзаны адзінарнымі і здвоенымі прамавугольнымі вокнамі, фланкіраванымі вертыкальнымі брусамі-сцяжкамі. У інтэр'еры пануе падкупальная прастора светлавога барабана, абапёртага праз складаную сістэму ветразяў на сцены цэнтральнага квадратнага зруба. У яго прастору шырокімі 3-граннымі прасветамі расчыняюцца бакавыя прыдзелы, трапезная і вылучаная драўляным 2-ярусным іканастасам апсіда. Мастацкую каштоўнасць маюць абраз «Тры свяціцелі» (XVIII-XIX ст.ст.), скульптура «Раскрыжаванне» (XVIII ст.), драўляны разны ківот (1887 г.).

**Акцябрская** Пакроўская царква // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. – Мінск, 2013. – Т. 1. – С. 101.

**Свята-Пакроўская** царква ў в. Акцябр // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 468. – (Архітэктурная спадчына Кобрыншчыны).

## Свята-Прачысценская царква в. Дзівін *(1902 г.)* – 115 гадоў

**Свята-Прачысценская царква** знаходзіцца ў цэнтры вёскі Дзівін. Тып храма з трохчасткавай аб'ёмнай кампазіцыяй традыцыйны для драўлянага культавага дойлідства Беларусі. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю. Хадайніцтва аб будаўніцтве новай царквы з-за трухлявасці старой было пададзена прыхаджанамі яшчэ ў 1879 г. Узведзена ў 1902 г. 4-частковая аб'ёмная кампазіцыя складаецца з прытвора-званіцы, кароткага бабінца, малітоўнай залы,



апсіды. Унутры апсіда вылучана драўляным іканастасам. Над пакатым 4-схільным дахам асноўнага аб'ёму надбудаваны нізкі 4-гранны пастамент для 8-граннага барабана, завершанага цыбулепадобным купалам. Уваход арганізаваны праз нізкі прытвор пад двухсхільным дашкам. Гарызантальна ашаляваныя фасады апяразаны разнымі фрызамі і падзорамі. Мастацкую каштоўнасць маюць абразы XVIII-XIX стст. «Прападобны Ануфрый», «Божая Маці Адзігітрыя», «Святыя Варвара і Андрэй», «Святыя Мікола і Мітрафаній», «Мікола Цудатворац», «Дабравешчанне», «Узнясенне Хрыстова», «Нараджэнне Божай Маці», «Спас Пантакратар».

Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Дзівінская** царква Раства Багародзіцы // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. – Мінск, 2013. – Т. 3. – С. 395.

**Марчук, Н.** Православные храмы Дивина / Нина Марчук // Кобрин-информ. – 2014. – 16 октября. – С. 11.

## Свята-Троіцкая царква в. Казішча *(1927 г.)* – 90 гадоў

**Свята-Троіцкая царква** размешчана каля могілак на паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі Казішча. Пабудавана ў 1927 г. Вырашана выцягнутым прамавугольным зрубам, да якога далучаюцца 5-гранная апсіда і прытвор. Над 4-схільным дахам храма ўзведзены 8-гранны барабан з цыбулепадобным купалам. Вертыкальнай дамінантай кампазіцыі з'яўляецца чацверыковая шатровая званіца з макаўкай над прытворам. Галоўны ўваход афармлены 4-слуповым ганкам з 3-вугольным франтонам. Вертыкальнай шалёўкай вылучаны цокальная і фрызавая часткі, гарызантальна ашаляваныя плоскасці сцен прарэзаны прамавугольнымі і арачнымі вокнамі.



Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Свята- Троіцкая** царква ў в. Казішча // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 468. – (Архітэктурная спадчына Кобрыншчыны).

# Памятныя даты вядомых людзей, жыццё і дзейнасць якіх звязана з краем

## 95 гадоў з дня нараджэння І. В. Азарчука

**Азарчук Іван Васільевіч** нарадзіўся ў 1922 г. у в. Мяфёдавічы Кобрынскага раёна. Быў адным з арганізатараў камсамольскага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны, сувязны партызанскіх атрадаў Брэсцкага партызанскага злучэння. З кастрычніка 1943 г. партызан атрада імя Катоўскага. Загінуў у сакавіку 1944 г. пры выкананні баявога задання.

**Азарчук** Іван Васільевіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 219. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## 100 гадоў з дня нараджэння Ф. М. Алісіевіча

**Алісіевіч Фёдар Максімавіч** нарадзіўся ў 1917 г. у в. Каўпыніца (цяпер в. Колас) Крупскага раёна Мінскай вобласці Закончыў гістарычны факультэт Аршанскага настаўніцкага інстытута. З кастрычніка 1939 г. да кастрычніка 1940 г. служыў у Чырвонай арміі. У красавіку - кастрычніку 1943 г. вучыўся у Беларускай школе падрыхтоўкі партызанскіх кадраў на станцыі Сходня Хімкінскага раёна Маскоўскай вобл. У кастрычніку 1943 г. закінуты ў Кобрынскі раён, прызначаны памочнікам камісара партызанскай брыгады імя Чапаева па камсамоле, адначасова з’яўляўся сакратаром Кобрынскага раённага падпольнага камітэта ЛКСМБ. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. З сакавіка 1945 г. да снежня 1950 г. працаваў у апараце Брэсцкага абкама ЛКСМБ, пазней Брэсцкага абкама КПБ. Памёр у 1975 г.

**Алісіевіч** Фёдар Максімавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 213. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## 75 гадоў з дня нараджэння Г. А. Антанюка

**Антанюк Георгій Аляксандравіч** – беларускі філосаф, доктар філасофскіх навук (1991), прафесар (1993). Нарадзіўся 13 лістапада 1942 г. у в. Мацы Кобрынскага раёна. Пасля заканчэння Магілёўскага машынабудаўнічага тэхнікума служыў у Савецкай арміі. У 1970 г. закончыў філасофскі факультэт Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Вучыўся ў аспірантуры Інстытута філасофіі і права АН БССР. З 1973 г. малодшы, потым старшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі і права АН БССР. У 1974 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па сістэмным падыходзе ў сацыялагічных даследаваннях. З 1980 г.



старшы выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры філасофіі Нацыянальнай АН Беларусі. Доктарская дысертацыя прысвечана метадалагічным праблемам праектавання сацыяльных адносін. Аўтар шэрагу прац: «Сацыяльнае праектаванне: Некаторыя метадалагічныя аспекты» (1978), «Сацыяльнае праектаванне і кіраванне грамадскім развіццём: тэарэтыка-метадалагічны аспект» (1986), «Сацыяльнае праектаванне ў працэсе практычнага прымянення сацыяльных ведаў» (1992) і інш. Г. А. Антанюк быў наватарам у распрацоўцы метадалогіі сацыяльна-інжынернага праектавання. З 1990-х гадоў паступова пераходзіць да крытычнага пераасэнсавання філасофіі і ў цэлым ідэалогіі як крыніцы аб'ектыўнага пазнання. Даследуе агульнасацыяльныя і агульнафіласофскія праблемы, вывучае праблемы сістэмнага падыходу ў сацыялагічным даследаванні, метадалогіі навуковага пазнання, а таксама маралі, палітыкі, ідэалогіі і дзяржаўнага будаўніцтва, рэлігіі, нацыянальна-этнічных адносін і інш. З 1992 рэгулярна публікуецца ў СМІ па розных актуальных праблемах Беларусі і Расіі, і праблемам, якія існуюць ва ўзаемаадносінах паміж гэтымі краінамі.

**Антонюк** Георгий Александрович // Регионы Беларуси : в 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Мінск, 2009. – Кн. 1. - С. 22.

**Антанюк** Георгій Аляксандравіч // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. – Мінск, 2010. – Т. 1. - С. 171.

**Антанюк** Георгій Аляксандравіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 431. – (Імі ганарацца землякі).

**Елсуков, А. Н.** Антонюк Георгий Александрович / А. Н. Елсуков // Социологическая энциклопедия. – Минск, 2005. – С. 20.

**Кавецкий, С. Т.** Брестчина социологическая. Антонюк Георгий Александрович / С. Т. Кавецкий // Брестский социологический барометр / С. Т. Кавецкий. – Брест, 2005. – С. 25.

**З філасофскім** падыходам да жыцця // Кобрынскі веснік. – 2013. – 23 лютага. – С. 4.

Пра вядомага беларускага філосафа Г. Антанюка, ураджэнца в. Мацы.

## 105 гадоў з дня нараджэння В. С. Бандзярука

**Бандзярук Васіль Сцяпанавіч**, яфрэйтар, нарадзіўся ў 1912 г. у в. Астромічы. Узнагароджаны медалём «За ўдзел у абарончай вайне 1939 года».

**Бандзярук** Васіль Сцяпанавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 121.

## 95 гадоў з ня нараджэння С. Н. Батуліна

**Батулін Сцяпан Нічыпаравіч** нарадзіўся ў 1922 г. у в. Задзернава. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1943 г. знаходзіўся ў партызанскім атрадзе імя Фрунзе Брэсцкага злучэння, з 1944 г. на фронце ў радах Савецкай арміі. Пасля вайны працаваў на лесараспрацоўках Урала. З 1956 г. па 1974 г. быў брыгадзірам паляводчай брыгады ў калгасе «Зара» Кобрынскага раёна, потым кіраваў дапаможнай гаспадаркай калгаса "Зара".

Узнагароджаны ордэнам Леніна (1965 г.), іншымі ўзнагародамі.

**Батулін** Сцяпан Нічыпаравіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 426-427. – (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. Степан Никифорович Батулин // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

## 70 гадоў з дня нараджэння А. Я. Бельскага

**Бельскі** Аляксей Якімавіч - вучоны. Нарадзіўся ў 1947 г. у в. Стрыі. Кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.



Кірункі навуковых даследаванняў: распрацоўка стабільных крыніц ваганняў ЗВЧ дыяпазону; даследаванне шумавых уласцівасцяў ЗВЧ прыбораў і прылад.

Асноўныя публікацыі:

- Оценка шумовых характеристик волноводного генератора на диоде Ганна КВЧ диапазона / Бельский А. Я., Дробот С. В., Мошинский А. В., Русакович В. Н.;
- Анализ влияния факторов нестабильности задающего СВЧ генератора на работу твердотельного доплеровского датчика скорости / Бельский А. Я., Дробот С. В., Мошинский А. В.;
- Шумовые параметры генератора на диоде Ганна с варакторной перестройкой частоты / Бельский А. Я., Дробот С. В.;
- Лабораторный практикум по курсу "Электронные приборы" для студентов всех специальностей БГУИР в 2 Ч. Ч. 1. Активные компоненты полупроводниковой электроники / Бельский А. Я.

**Бельскі** Аляксей Якімавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

**Бельский** Алексей Якимович [Электронный ресурс] // Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники. - Режим доступа: https://www.bsuir.by/ru/kaf-elektroniki/belskiy-a-ya. – Дата доступа: 06.02.2017.

## 105 гадоў з дня нараджэння У. С. Валасевіча

**Валасевіч Уладзімір Сяргеевіч**, радавы, нарадзіўся ў 1912 у в. Клятышча. Узнагароджаны медалём «За ўдзел у абарончай вайне 1939 года».

**Валасевіч** Уладзімір Сяргеевіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. – С. 121. – (Узнагароджаныя медалём «За ўдзел у абарончай вайне 1939 года»).

## 75 гадоў з дня нараджэння Л. Я. Верхавец

**Верхавец Людміла Якаўлеўна**, вучоны. Нарадзілася ў 1942 г. у в. Літвінкі. Кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Віцебскага тэхнічнага ўніверсітэта.

**Верхавец** Людміла Якаўлеўна // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 432. - (Імі ганарацца землякі).

## 100 гадоў з дня нараджэння В. І. Вольскага

**Вольскі Васіль Іванавіч**, радавы, нарадзіўся ў 1917 г. у в. Нятрэба. Узнагароджаны медалём «За ўдзел у абарончай вайне 1939 года».

**Вольскі** Васіль Іванавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 121.

## 110 гадоў з дня нараджэння В. Е. Ворана

**Воран Васіль Еўдакімавіч** нарадзіўся ў 1907 г., в. Літвінкі Батчынскага сельсавета, Кобрынскага раёна, Брэсцкай вобласці, у сям'і сялян, беларус, член КПЗБ.



У 1940 годзе быў выбраны першым старшынёй калгаса "Заветы Ільіча". Пад час Вялікай Айчыннай вайны - связны партызанскага атрада імя Чапаева. Пасля вайны прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі калгаса. З 1948 года працаваў старшынёй калгаса "За Радзіму". З красавіка 1953 года па 1978 год працаваў брыгадзірам комплекснай брыгады ў в. Літвінкі калгаса "Заветы Ільіча". Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Знамені, медалямі "За доблестную працу", "Ветэран працы", "20 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне", Пачэснай граматай Вярхоўнага Савета БССР "За поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі" і іншымі граматамі. Выбіраўся дэлегатам 3 з'езда калгаснікаў Беларусі ў 1969 годзе. Дзевяць сазываў выбіраўся дэпутатам сельскага Савета народных дэпутатаў з 1950 г. па 1977 г. З'яўляўся персанальным пенсіянерам мясцовага значэння. Памёр у 1997 годзе.

**Воран Васіль Еўдакімавіч** [Электронны рэсурс] // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Кобрын, 2002.

## 95 гадоў з дня нараджэння А. А. Вяткіна

**Вяткін Анатоль Аляксандравіч** нарадзіўся ў 1922 г. У Вялікую Айчынную вайну са жніўня 1942 г. на фронце, артылерыст. Ваяваў у 60-м гвардзейскім карпусным артылерыйскім палку, быў камандзірам 6-й батарэі 2-га артдывізіёна. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына. З мая 1945 г. у запасе, палкоўнік.



Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, 16 медалямі.

**Вяткін** Анатоль Аляксандравіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 234. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## 105 гадоў з дня нараджэння К. С. Гапасюка

**Гапасюк Канстанцін Сцяпанавіч** нарадзіўся 7 верасня 1912 г. у в. Рэчыца



Кобрынскага раёна. Працаваў у сельскай гаспадарцы. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР - у органах міліцыі, у народным судзе. У верасні 1941 г. далучыўся да групы ваеннаслужачых, якія апынуліся ў Дахлаўскім лесе, стаў партызанам атрада імя Чапаева, камандаваў спачатку ўзводам, потым ротай. У студзені 1944 г. на базе атрада імя Чапаева была створана партызанская брыгада імя Чапаева Брэсцкай вобласці, камандзірам якой у студзені - маі, а з мая 1944 г. намеснікам камандзіра быў К. С. Гапасюк. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Пасля вызвалення Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў працаваў намеснікам старшыні Кобрынскага гарсавета, потым на гаспадарчай рабоце. Памёр у 1991 г.

**Гапасюк** Канстанцін Сцяпанавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 215. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## 95 гадоў з дня нараджэння З. З. Дзенісюка

**Дзенісюк Захар Захаравіч** нарадзіўся ў 1922 г. у в. Мяфёдавічы Кобрынскага



раёна. У перыяд знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы быў парабкам, сакратаром сельскай ячэйкі КСМЗБ у роднай вёсцы. У 1940-1941 гг. у час аднаўленчых работ на Дняпроўска-Бугскім канале ўзначальваў ударную камсамольскую брыгаду. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны падпольшчык, наладзіў сувязь з Турнянскім антыфашысцкім камітэтам, вёў працу па далучэнні камсамольцаў да барацьбы супраць акупантаў. З 1943 г. у асобным партызанскім атрадзе імя Катоўскага, разведчык, падрыўнік. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вайны працаваў старшынёй сельсавета, у гарадской камунальнай гаспадарцы Кобрына.

**Дзенісюк** Захар Захаравіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 220. – (Змагаліся ў тыле ворага).



## 95 гадоў з дня нараджэння Г. Я. Дмітрук

**Дзмітрук Ганна Якаўлеўна** нарадзілася ў 1922 г. у в. Барысава. У 1948 г. адной з першых уступіла ў калгас. Працавала даяркай больш за 30 гадоў. Неаднаразова з'яўлялася пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва сярод жывёлаводаў гаспадаркі. Узнагароджана ордэнам Леніна (1971), медалём.

**Дзмітрук** Ганна Якаўлеўна // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 427. – (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. Анна Яковлевна Дмитрук // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

## 80 гадоў з дня нараджэння З. У. Дубінкі

**Дубінка Зоя Уладзіміраўна** нарадзілася ў 1937 г. у в. Дзядзічы Іўеўскага раёна. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі (1986), Закончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1967). Працавала заатэхнікам, намеснікам старшыні калгаса «Зара». Узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны».

**Дубінка** Зоя Уладзіміраўна // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 429. - (Вызначыліся працай).

## 80 гадоў з дня нараджэння М. К. Дубінкі

**Дубінка Міхаіл Калістратавіч** нарадзіўся ў 1937 г. у в. Хідры. Працоўную дзейнасць пачаў у 1953 г. калгаснікам. Пасля службы ў радах Савецкай арміі з 1960 года стаў працаваць брыгадзірам у калгасе "Зара" Кобрынскага раёна. Пад яго кіраўніцтвам брыгада штогод дабівалася высокіх вытворчых паказчыкаў. У 1976 г. за поспехі ў працы яму прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1980-1985 гг. Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.



**Адамович, А.** Полюшко-поле / А. Адамович // Земные звёзды : Очерки о Героях Социалистического Труда Брестской области. - Минск, 1978. - С. 87-91.

О Герое Социалистического Труда Кобринского района М. К. Дубинке.

**Дубинка** Михаил Калистратович // Регионы Беларуси : в 7 т. Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 355.

**Дубинка** Михаил Калистратович // Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда : биографический справочник. – Минск, 2014. – С. 96.

**Дубінка** Мікалай Калістратавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 426. - (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен звездой Героя. Михаил Калистратович Дубинка // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Дубинка** Михаил Калистратович // Кобрынскі веснік. - 2011. - 10 верасня. - С. 4.

**Пераможцы** спаборніцтва // Камуністычная праца. - 1987. - 6 чэрвеня.

Пра М. К. Дубінку – брыгадзіра калгаса "Зара", узнагароджанага Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Леніна.

## 95 гадоў з дня нараджэння К. Е. Дулько

**Дулько Канстанцін Еўдакімавіч** нарадзіўся ў 1922 г. у Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці. Закончыў Пінскую сельскагаспадарчую школу. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. у партызанскім атрадзе імя Чапаева, сувязны, падрыўнік. З удзелам К. Е. Дулько пушчана пад адхон 18 эшалонаў ворага, знішчана 13 аўтамашын. З лета 1944 г. у Чырвонай арміі, ваяваў у складзе 64-га артылерыйскага палка асобнай процітанкавай брыгады. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына, Прыбалтыкі. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны працаваў старшынёй калгаса «Шлях да камунізму», старшынёй Залескага сельсавета, сакратаром партарганізацыі калгаса імя Дзімітрова.

**Дулько** Канстанцін Еўдакімавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 220. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## 215 гадоў з дня нараджэння І. Жалязоўскага

**Ігнацій Жалязоўскі** (свец. Якаў Лявонцьевіч) - рэлігійны праваслаўны дзеяч, епіскап Брэсцкі.



Нарадзіўся ў в. Вялікія Сяхновічы Кобрынскага павета (цяпер Жабінскаўскі р-н Брэсцкай вобл.) у сям'і уніяцкага святара. Сыну, народжанаму 10 (22) студзеня 1802 года, бацька сяхновіцкі святар Лявонцій Жалязоўскі пры хрышчэнні першапачаткова даў імя Якаў. З першых дзён яго лёс быў прадвызначаны: бацька бачыў у сыне толькі святара. Таму, атрымаўшы пачатковыя веды, Якаў Жалязоўскі быў залічаны ў Галоўную духоўную семінарыю, якая дзейнічала пры універсітэце ў Вільні. Пасля паспяховага завяршэння навучання ён вярнуўся на радзіму ў якасці настаўніка Кобрынскага духоўнага вучылішча, дзе працаваў да 1834 года.

У 1836-1839 гг. - інспектар Літоўскай семінарыі. У час Полацкага царкоўнага сабора 1839 падпісаў сярод іншых святароў «Саборны акт аб уз'яднанні» ўніяцкай царквы з праваслаўнай. У 1839-1948 гг. - настаяцель Барысаглебскай (Каложскай) царквы ў Гродне, клапаціўся аб захаванні гэтага помніка архітэктуры, які і сёння застаецца гонарам і прыгажосцю зямлі беларускай. У 1848-1970 гг. - вікарны епіскап Брэсцкі, жыў у Жыровічах і Гродне (з 1852). У новым высокім званні Ігнацій Жалязоўскі пачаў дзейнічаць надзвычай энергічна. Менш чым за дзесяцігоддзе ён асабіста агледзеў усе цэрквы, уключаныя ў межы епархіі, пры гэтым уласнаручна асвяціў 16 храмаў, большасць з якіх была ператворана з каталіцкіх ці уніяцкіх храмаў. З асаблівай ахвотай, з цёплым адчуваннем радасці епіскап вяртаўся на радзіму. Калі летам 1852 года ўладыка аглядаў 65 храмаў Кобрынскага павета, ён не мог абмінуць Вялікія Сяхновічы. Можна толькі здагадвацца, якія думкі, успаміны наведвалі Ігнація пры набліжэнні да зямлі продкаў, што падаравала яму жыццё. Нямала сіл брэсцкі епіскап ахвяраваў на тое, каб навучыць мясцовых святароў правільнаму выкананню сваіх абавязкаў. Уладыка мэтанакіравана адстойваў ідэю канчатковага ўсталявання праваслаўя, меў дастаткова аўтарытэту, каб адстойваць яе перад вельмі значнымі асобамі. Пасля паўстання 1863-1864 гг. садзейнічаў

закрыццю касцёлаў і пераўтварэнню іх у цэрквы. 21 чэрвеня 1870 г. з-за хваробы пакінуў епіскапскую кафедру, апошнія гады жыў у Гродне, займаўся мецэнацтвам, збіраў бібліятэку. Яшчэ перад смерцю Ігнацій Жалязоўскі пажадаў выканаць даўняе абяцанне і пакланіцца праваслаўным святыням у Кіеве, дзе ў верасні 1870 года ён адслужыў апошнюю ў жыцці службу. 1 (13) красавіка 1872 года І. Жалязоўскага не стала. На пахаванне, якое згодна традыцыі адбылося на трэці дзень пасля смерці, прыехалі архіепіскап мінскі Міхаіл, ад якога ў 1848 годзе ўладыка Ігнацій прыняў брэсцкую кафедру, і Яўгеній, якому яе перадаў у 1870 годзе, зыходзячы на пакой.

З 1875 у Віленскім духоўным вучылішчы была ўстаноўлена імянная стыпендыя епіскапа Ігнацiя для дзяцей-сірот, якія паказвалі выдатныя здольнасці ў авалоданні навукамі і добрых у сваіх паводзінах. Фундатарамі стыпендыі сталі протаіерэй Антоній Катовіч, святары Іаан Лявіцкі, Васіль Макавецкі, іншыя бліжэйшыя родзічы нябожчыка.

У 1889 годзе, калі ў Расійскай імперыі шырока святкаваліся 50-я ўгодкі ўз'яднання уніяцкай царквы з праваслаўем, ва ўсіх храмах служылася літургія ў памяць падзеі. Сярод імёнаў стваральнікаў гэтага факту неаднаразова гучала імя, пеліся царкоўныя гімны ў светлую памяць уладыкі Ігнація Лявонц'евіча Жалязоўскага, былога епіскапа брэсцкага.


**Бензярук, А.** Жалязоўскі Ігнацій / Анатоль Бензярук // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1996. - Т. 3. – С. 364.

**Бензярук, А. Р**. Жалязоўскі І. (1802-1872) / А. Р. Бензярук // Асветнікі зямлі Беларускай : энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001. - С. 164.

**Бензярук, А.** Ігнацій Жалязоўскі, Якаў Лявонцьевіч епіскап Брэсцкі (1802-1872) / А. Бензярук // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа. - Гродна, 2009. - Ч. 1. - С. 329-333.

**Жалязоўскі** Ігнацій // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Жабінкаўскага раёна / рэд.-укл. Р. Я. Смірнова. - Мінск, 1999. - С. 131-133, 492, 502.

**Орловский, Е**. Судьбы православия в связи с историею латинства и унии в Гродненской губернии в XIX столетии (1794 - 1900) / Е. Орловский. - Гродна, 1903. - С. 83-85, 133-136, 142-160, 215-217, 238-252, 259-261, 282-284, 297, 298.

**Черепица, В.** Не потерять связующую нить / В. Черепица. - Гродно, 2003. - С. 96-97.

**Носко, М.** Игнатий Желязовский, Яков Леонтьевич, епископ Брестский (1802-1872) / Михаил Носко // Брестские епархиальные ведомости. - 2005. - № 2. - С. 45-46.

**Знакамітыя** асобы Жабінкаўшчыны [Электронны рэсурс] // Жабинковская централизованная библиотечная система. – Рэжым доступу: http://zhabinkalib.by/. – Дата доступу: 16. 01. 2017.


## 80 гадоў з з дня нараджэння С. Д. Зінчука

**Зінчук** Сцяпан Дзмітрыевіч – вучоны-педагог. Нарадзіўся ў 1937 г. у в. Астромічы. Кандыдат педагагічных навук, дацэнт Беларускага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка.

**Зінчук** Сцяпан Дзмітрыевіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 435. – (Імі ганарацца землякі).

## 70 годоў з дня нараджэння М. В. Знахарчука

**Знахарчук Мікалай Васільевіч** - афіцэр-падводнік, загінуў пры выкананні



службовых абавязкаў. Нарадзіўся 22 кастрычніка 1947 г. у в. Дзівін. Закончыў Севастопальскае вышэйшае ваенна-марское вучылішча. Па размеркаванні трапіў на Паўночны флот у 1-ю флатылію атамных падводных лодак. Геройскі загінуў у 1976 годзе. Цаной асабістага жыцця тры капітаны, у тым ліку і М. Знахарчук, ліквідавалі пажар на лодцы і яго наступствы.

**Знахарчук** Мікалай Васільевіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 435. - (Імі ганарацца землякі).

## 55 гадоў з дня нараджэння В. І. Іўчанкава

**Іўчанкаў** Віктар Іванавіч – лінгвіст, педагог, журналіст, мовазнавец. Зас



навальнік беларускай навуковай школы дыскурснага аналізу сродкаў масавай інфармацыі, вядучы распрацоўшчык сучасных напрамкаў ва ўпарадкаванні норм правапісу беларускай мовы, аўтар вучэбных дапаможнікаў для сярэдняй і вышэйшай школы, метадычных праграм, выдатнік адукацыі Беларусі, лаўрэат прэміі Беларускага саюза журналістаў "Залатое пяро" (2010 г.). Кандыдат філалагічных навук (1988 г.), дацэнт.

Нарадзіўся 28 чэрвеня 1962 г. у в. Хадынічы Навасёлкаўскага с/с Кобрынскага раёна. Працаваў настаўнікам у Бельскай васьмігадовай школе (1980-1983 гг.). Закончыў Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут (1985 г.), аспірантуру пры Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР (1988 г.).

Працаваў выкладчыкам Брэсцкага дзяржаўнага педінстытута (1985 г.); выкладчыкам кафедры агульнага, славянскага і рускага мовазнаўства Мінскага педагагічнага інстытута (1988-1989 гг.). З 1990 г. дацэнт, з 1996 г. загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Саветнік міністра адукацыі па сувязях са СМІ і грамадскасцю. Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Член Беларускага саюза журналістаў. Аўтар звыш 60 навуковых і навукова-метадычных работ, у т. л. дзвюх манаграфій, звыш 100 публіцыстычных матэрыялаў. Намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Беларуская мова і літаратура», член рэдкалегіі часопіса «Роднае слова».

Займаецца стылістыкай беларускай і рускай моў, лінгвістыкай публіцыстычнага тэксту, рыторыкай. Асноўныя працы: «Лінгвістычная арганізацыя тэксту. У творчай лабараторыі Уладзіміра Караткевіча» (2002), «Лінгвастылістыка тропаў Юрыя Казакова» (2002). Аўтар падручніка «Сучасная беларуская мова. Арфаграфія. Графіка. Лексікалогія (фразеалогія). Ч. 1» (2001), вучэбнага

дапаможніка «Святло слова» (у сааўтарстве) (2002), праграм для студэнтаў факультэтаў журналістыкі ВНУ і інш.

**Ивченков** Виктор Иванович // Регионы Беларуси : в 7 т. Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 425.

**Іўчанкаў** Віктар Іванавіч // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. – Мінск, 2012. – Т. 4. - С. 229.

**Іўчанкаў В. І.** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 435 : фота. - (Імі ганарацца землякі).

**Іўчанкаў, В.** "Слова стала самым дарагім і каштоўным прадуктам…" / Віктар Іўчанкаў // Роднае слова. – 2012. - № 7. – С. 26.

**Іўчанкаў** Віктар Іванавіч (1962, Кобр. р-н) – 50 гадоў з дня нараджэння // Новыя кнігі. - 2011. - № 9. - С. 4 - (Дадатак).

## 85 гадоў з дня нараджэння В. К. Казловіча

**Казловіч Віталь Кірылавіч** нарадзіўся ў 1932 г. у в. Іласк. Працоўную



дзейнасць пачаў у 1949 г. у калгасе. Пасля службы ў Савецкай арміі (1951-1954 гг.) вярнуўся ў калгас «Праўда» Кобрынскага раёна, дзе больш за 20 гадоў узначальваў паляводчую брыгаду. Потым працаваў у калгасе загадчыкам склада гаруча-змазачных матэрыялаў. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1972), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971), іншымі ўзнагародамі.

**Казловіч** Віталь Кірылавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 427. – (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. Виталий Кириллович Козлович // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

## 95 гадоў з дня нараджэння Г. С. Камялеўскай

**Камялеўская Ганна Сяргееўна** нарадзілася ў 1922 г. у в. Андронава. Перад



Вялікай Айчыннай вайной пераехала ў Казахстан, дзе працавала даяркай у адным з саўгасаў. Пасля вайны вярнулася ў родную вёску і працавала ў калгасе, а з 1962 г. - на Кобрынскай птушкафабрыцы. Узнагароджана ордэнамі Леніна (1971), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1975), іншымі ўзнагародамі.

**Камялеўская** Ганна Сяргееўна // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. Анна Сергеевна Камелевская // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

## 110 гадоў з дня нараджэння А. Р. Карасюка

**Карасюк Аляксандр Рыгоравіч**, радавы, нарадзіўся ў 1907 у в. Грушава. Узнагароджаны медалём «За ўдзел у абарончай вайне 1939 года».

**Карасюк** Аляксандр Рыгоравіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 121.

## 110 гадоў з дня нараджэння А. Г. Кастылюка

**Кастылюк Арсеній Гаўрылавіч**, радавы, нарадзіўся ў 1907 у в. Кустовічы. Узнагароджаны медалём «За ўдзел у абарончай вайне 1939 года».

**Кастылюк** Арсеній Гаўрылавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 121.

## 115 гадоў з дня нараджэння Ф. Е. Кастылюка

**Кастылюк Феадосій Емяльянавіч**. Нарадзіўся ў 1902 г. у в. Паляцічы Кобрынскага раёна. У 1924 г. уступіў у КПЗБ. Быў сакратаром ячэйкі ў роднай вёсцы, членам Кобрынскага райкама, Брэсцкага акругкама КПЗБ. Адзін з арганізатараў першамайскай дэманстрацыі ў 1925 г. у Кобрыне. У 1926 г. арыштаваны польскімі ўладамі і ў 1927 г. прыгавораны да 4 гадоў турмы. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся на радзіму, займаўся аднаўленнем разгромленых паліцыяй ячэек КПЗБ. У 1931 г. зноў арыштаваны, аднак за недаказанасцю віны ў 1932 г. вызвалены. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР (верасень 1939) працаваў у органах унутраных спраў, загадчыкам аддзела сацыяльнага забеспячэння ў Кобрыне. У Вялікую Айчынную вайну сувязны партызанскага атрада імя Чапаева аднайменнай брыгады. Пасля вайны працаваў у сістэме сацыяльнага забеспячэння ў Кобрыне, у калгасе ў в. Паляцічы.



**Кастылюк** Феадосій Емяльянавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 114. – (Удзельнікі рэвалюцыйных выступленняў на Кобрыншчыне (1921-1939).

## 95 гадоў з дня нараджэння В. С. Качана

**Качан Віктар Сцяпанавіч** нарадзіўся 21.11.1922 г. у в. Петрыцкае Брагінскага раёна Гомельскай вобласці, у сялянскай сям'і. Закончыў рабфак у Мінску, Брэсцкі настаўніцкі інстытут (1955 г.). Да вайны працаваў настаўнікам у г. Мар'іна Горка Мінскай вобласці. З лістапада 1943 г. у Чырвонай арміі, прымаў удзел у ваенных дзеяннях. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, медалём. Пасля дэмабілізацыі ў 1946 г. быў дырэктарам сямігадовай школы ў в. Хідры, з 1961 г. сярэдняй школы ў в. Залессе, потым загадчыкам Кобрынскага районо. З 1963 г. працаваў загадчыкам вучэбнай часткі школы рабочай моладзі, у 1967-1982 гг. - дырэктарам сярэдняй школы № 1 Кобрына. Памёр 22.09.1982 г.

**Качан** Віктар Сцяпанавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 243. – (Крутымі дарогамі вайны).

## 105 гадоў з дня нараджэння М. І. Кірылава

**Кірылаў Міхаіл Ільіч** нарадзіўся ў 1912 г. у в. Ігнацьеўка Новасібірскай вобласці, Расія. У 1936 г. закончыў настаўніцкі інстытут у г. Омск. У час вайны быў у партызанскім атрадзе імя Чапаева. У 1944-1945 гг. - загадчык Кобрынскага раённага аддзела народнай адукацыі, з 1945 г. настаўнік, потым завуч СШ № 1 Кобрына, у 1963-1976 гг. - дырэктар СШ № 5.

Выбіраўся дэпутатам гарадскога Савета. Друкаваўся ў часопісах «Народная асвета» (г. Масква), «Нёман». У 1972 г. атрымаў літаратурную прэмію за лепшую публікацыю года. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Званне ”Заслужаны настаўнік” прысвоена ў 1967 г. Памёр у 1992 г.

**Кірылаў** Міхаіл Ільіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

## 100 гадоў з дня нараджэння К. К. Краўчука

**Краўчук Канстанцін Кірылавіч** нарадзіўся ў 1917 г. у в. Нарты Мамадышскага раёна Татарстана, дзе сям’я была ў бежанстве з часоў Першай сусветнай вайны. У 1920-я гады сям’я вярнулася ў Кобрын. З сакавіка 1943 г. да чэрвеня 1944 г. ваяваў у партызанскім атрадзе імя Чапаева брыгады імя Чапаева. Удзельнічаў у многіх партызанскіх акцыях, але больш за ўсё вызначыўся як падрыўнік: на яго рахунку 23 варожыя эшалоны, узарваныя або пушчаныя пад адхон. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, медалямі. Пасля вайны працаваў лесніком у в. Дахлава Кобрынскага раёна, пазней жыў у Кобрыне.



**Краўчук** Канстанцін Кірылавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 221. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## 105 гадоў з дня нараджэння Л. А. Кузіча

**Кузіч Лявонцій Астапавіч**, радавы, нарадзіўся ў 1912 у в. Павіцце. Узнагароджаны медалём «За ўдзел у абарончай вайне 1939 года».

**Кузіч** Лявонцій Астапавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 121.

## 100 гадоў з дня нараджэння Я. І. Куніцкага

**Куніцкі Яўген Іосіфавіч**, радавы, нарадзіўся ў 1917 у в. Гарадзец. Узнагароджаны медалём «За ўдзел у абарончай вайне 1939 года».

**Куніцкі** Яўген Іосіфавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 121.

## 90 гадоў з дня нараджэння М. Т. Куца

**Куц Мікалай Трафімавіч** нарадзіўся 20 сакавіка 1927 г. у в. Сухоўчыцы Кобрынскага раёна. У 1942-1943 гг. быў членам падпольнай антыфашысцкай групы, сувязным партызанскіх атрадаў імя Чарнака, імя Фрунзе, імя Сталіна. З 1944 г. у Чырвонай арміі, стралок 115-й гвардзейскай дывізіі. У 1948-1980 гг. працаваў у органах унутраных спраў. Узнагароджаны медалямі.

**Куц** Мікалай Трафімавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 222. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## 100 гадоў з дня нараджэння П. Ф. Лакаткова

**Лакаткоў Пётр Фёдаравіч** нарадзіўся ў 1917 г. у Чабаркульскім раёне Чэлябінскай вобласці. Перад Вялікай Айчыннай вайной прызваны ў Чырвоную армію, служыў у Гродне. З першых дзён вайны ўдзельнічаў у абарончых баях, трапіў у палон, уцёк. Уключыўся ў партызанскую барацьбу на Брэстчыне, удзельнічаў у вызваленні Кобрына. З 1944 г. у дзеючай арміі, ваяваў на 1-м Украінскім фронце, разведчык. З кастрычніка 1944 г. да студзеня 1945 г. знаходзіўся ў тыле ворага, выконваў заданні савецкага камандавання. Пасля дэмабілізацыі з 1946 г. працаваў у Кобрыне. Узнагароджаны медалямі.

**Лакаткоў** Пётр Фёдаравіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 243-244. – (Крутымі дарогамі вайны).

## 100 гадоў з дня нараджэння С. І. Лебедзева

**Лебедзеў Сцяпан Іванавіч** нарадзіўся 27 снежня 1917 г. у Верхатурскім раёне



Свярдлоўскай вобласці. У 1939 г. закончыў Пермскую авіяцыйную школу і быў накіраваны ў 28-ы знішчальны авіяполк. У ліпені 1941 г. быў цяжка паранены, пасля лячэння накіраваны ў запасны авіяполк у Перм. З мая 1942 г. камандзір звяна, намеснік камандзіра авіяэскадрыллі 435-га знішчальнага палка на Карэльскім фронце. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вайны жыў і працаваў у Кобрыне. Памёр 8 ліпеня1983 г.

**Лебедзеў** Сцяпан Іванавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 244. – (Крутымі дарогамі вайны).



## 120 гадоў з дня нараджэння М. П. Леановіча

**Леановіч Максім Пракопавіч** нарадзіўся ў 1897 г. у в. Выгада Кобрынскага раёна. Адзін з кіраўнікоў падполля і партызанскага руху ў Брэсцкай вобласці. З 1918 г. у Чырвонай арміі. З 1921 г. на гаспадарчай, савецкай і партыйнай рабоце. У 1932 г. закончыў Камуністычны ўніверсітэт Беларусі імя Леніна. З 1940 г. дырэктар саўгаса ў Брэсцкай вобласці. У

1941-1942 гг. на гаспадарчай рабоце ў Варонежскай вобласці. Са жніўня 1943 г. у варожым тыле, кіраўнік спецгрупы ў Брэсцкай вобласці. У кастрычніку 1943 - студзені 1944 г. упаўнаважаны ЦК КП(б)Б і БШПР па Кобрынскім раёне, у студзені - ліпені 1944 г. камісар партызанскай брыгады імя В. І. Чапаева, адначасова ў снежні 1943 - ліпені 1944 г. сакратар Кобрынскага падпольнага райкома КП(б)Б. У 1945-1957 гг. на гаспадарчай рабоце ў г. Брэсце. Памёр 30.10.1968 г.

**Леановіч** Максім Пракопавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 215-216. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

## 105 гадоў з дня нараджэння А. С. Левага

**Левы Аляксей Сідаравіч**, радавы, нарадзіўся ў 1912 у в. Балоты. Узнагароджаны медалём «За ўдзел у абарончай вайне 1939 года».

**Левы** Аляксей Сідаравіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 121.

## 95 гадоў з дня нараджэння І. С. Любімава

**Любімаў Ігар Сяргеевіч** нарадзіўся ў 1922 г. У Вялікую Айчынную вайну ў 1941-1945 гг. на фронце, ад камандзіра ўзвода даслужыўся да памочніка начальніка штаба 60-га гвардзейскага Кобрынскага карпуснога артылерыйскага палка. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.



Пасля вайны дацэнт Ваеннай артылерыйскай акадэміі імя Калініна ў Санкт-Пецярбургу.

**Любімаў Ігар Сяргеевіч** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 235-236. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## 110 гадоў з дня нараджэння А. В. Лячова

**Лячоў Аляксандр Васільевіч** нарадзіўся ў 1907 г. у в. Соніна Балахнінскага раёна Ніжагародскай вобл. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны служыў у Брэсцкім аблваенкамаце. Удзельнічаў у баях у Брэсце. Трапіў у акружэнне, быў паранены і ўзяты ў палон, адкуль уцёк. 3 сакавіка 1942 г. да красавіка 1944 г. у партызанскім атрадзе імя Катоўскага. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, медалямі. У 1944-1970 гг. на гаспадарчай рабоце ў Брэсце.

**Лячоў** Аляксандр Васільевіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 223. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## 70 гадоў з дня нараджэння М. А. Макарука

**Макарук Мікалай Арсенцьевіч** – вучоны. Нарадзіўся ў 1947 г. у в. Мацы Кобрынскага раёна. Кандыдат вэтэрынарных навук, дацэнт Віцебскай акадэміі вэтэрынарнай медыцыны.

**Макарук** Мікалай Арсенцьевіч // Памяць: гісторыка-культурная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 437. – (Імі ганарацца землякі).

## 190 гадоў з дня нараджэння У. Ю. Малахоўскага

**Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч** (1827-1900) – рэвалюцыянер, вынаходнік, фотааматар, стваральнік прататыпа «Кодака». Адзін з кіраўнікоў паўстання 1863-1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Нарадзіўся ў 1827 г. у маёнтку Мацы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (сёння гэта Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці). Пасля хатняга навучання юнак набываў веды ў Свіслацкай гімназіі, якая адкрыла дарогу ў свет многім славутым людзям Беларусі. Закончыў Пецярбургскі інстытут інжынераў шляхоў зносін. Адзін з кіраўнікоў партыі «чырвоных», найбліжэйшы памочнік К. Каліноўскага. З чэрвеня 1863 г. уваходзіў у склад Аддзела кіраўніцтва правінцыямі Літвы, потым Выканаўчага аддзела Літвы. У лютым - сакавіку, чэрвені - жніўні 1863 г. паўстанцкі начальнік Вільні. Наладжваў сувязі з рускімі рэвалюцыянерамі, з арганізацыяй «Зямля і воля». Са жніўня 1863 г. за мяжой на нелегальным становішчы, выехаў у Пецярбург, потым у Кёнігсберг, дзе быў прадстаўніком Каліноўскага, удзельнічаў у выданні газеты «Глос з Літвы», займаўся закупкай і дастаўкай зброі для паўстанцаў.



З 1866 г. жыў у Англіі пад прозвішчам Леон Варнэрке. У англійскай сталіцы наш зямляк заснаваў уласную фірму, якая займалася фотасправай. Ужо праз пяць гадоў гэтая фірма стала шырока вядомай ва ўсёй Заходняй Еўропе. Набыў шырокую вядомасць шэрагам вынаходак у галіне фотатэхнікі, у 1875 г. сканструяваў фотаапарат са скручанай касетай, які спецыялісты лічаць прататыпам «Кодака». Важны ўклад унёс Малахоўскі ў сам працэс фатаграфавання: фотапласцінкі ён замяніў на плёнку, пакрытую бромсерабром. Яго адкрыццё выклікала пераварот у сусветнай фотасправе, паколькі нічога падобнага дагэтуль у свеце не было. Малахоўскі пачаў ездзіць па розных краінах і прапагандаваць свае адкрыцці. У 1880-я гады некалькі разоў пабываў у Расіі, у т. л. у Маскве і Пецярбургу, удзельнічаў у фотавыстаўках, у заснаванні секцыі фатаграфіі Расійскага імператарскага тэхнічнага таварыства. Апошнія гады жыў у Жэневе.



**Кісялёў, Г.** Малахоўскі Уладзіслаў Юльянавіч / Генадзь Кісялёў, Вячаслаў Шалькевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1999. - Т. 5. - С. 57.

**Марціновіч, А.** “Кодак” – з паўстанцкай падсветкай. Уладзіслаў Малахоўскі / Алесь Марціновіч // Хто мы, адкуль мы… : гістарычныя эсе, нарысы : у 3 кн. / Алесь Марціновіч. - Мінск, 2008. - Кн. 2. - С. 212-226.

**Марчук, Н.** Кобринские корни “Кодака” / Нина Марчук // Кобрин-информ. – 2015. – 4 июня. – С. 7.

Об уроженце д. Мацы В. Малаховском, создателе прототипа фотоаппарата “Кодак”.

**Марціновіч, А.** “Кодак” – з паўстанцкай падсветкай / Алесь Марціновіч // Маладосць. - 2006. - № 11. - С. 122-128.

Пра У. Малахоўскага, ураджэнца в. Мацы, займаўся фотасправай.

## 95 гадоў з дня нараджэння А. І. Марозава

**Марозаў Арсен Іванавіч** (1922-1944) – удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне, Герой Савецкага Саюза (1945 г.), імем якога названы сквер, вуліца ў г. Кобрыне.



Нарадзіўся 23 студзеня 1922 г. у в. Слабодка Цвярскога раёна. Закончыў прафтэхвучылішча ў г. Цвер (1938), Батайскую ваенную школу пілотаў (1941). Да вайны працаваў слесарам на Цвярской прадзільнай фабрыцы і займаўся ў аэраклубе.

З першых дзён вайны Марозаў дабраахвотнікам пайшоў на фронт. Ён прайшоў шлях ад радавога да намесніка камандзіра авіяэскадрыллі. Ваяваў на Паўднёвым, Заходнім і 1-ым Беларускім франтах. Зрабіў 271 баявы вылет, асабіста збіў 13 самалётаў праціўніка і 9 - у групавых баях. На штурм варожых войскаў зрабіў 32 баявыя вылеты. Знішчыў 4 варожыя самалёты на аэрадромах, 3 чыгуначныя вагоны з боепрыпасамі, 18 аўтамашын з грузам. Удзельнічаў у вызваленні Бабруйска, Слуцка, Баранавіч. А. І. Марозаў быў лепшым лётчыкам корпуса, любімцам палка і дывізіі.

У складзе 149-га Чырванасцяжнага Памеранскага знішчальнага палка, які базіраваўся на Кобрынскім аэрадроме, старшы лейтэнант А. І. Марозаў быў намеснікам камандзіра эскадрыллі. Калі пачаліся баі на подступах да Брэста, ён атрымаў заданне штаба фронту разведаць сілы гітлераўцаў і шляхі іх адступлення.

24 чэрвеня 1944 г. пасля паспяховай разведкі, звесткі пра якую ён перадаў па радыё, А. І. Марозаў вяртаўся на аэрадром, але ўбачыў вялікую колькасць варожай тэхнікі і войск і папрасіў дазволіць штурм. Лётчык, атрымаўшы смяротнае раненне, з апошнімі сіламі давёў падбіты самалёт да аэрадрома. Загінуў геройскі.

Ляснік, які назіраў за боем, падабраў мёртвага лётчыка і пахаваў яго. Пасля вызвалення Кобрына ён перадаў дакументы А. І. Марозава камандаванню палка і паказаў месца яго пахавання. Лётчык з ушанаваннямі быў перапахаваны ў г. Кобрыне на цэнтральнай плошчы Свабоды. У 1958 г. рашэннем Кобрынскага райвыканкама брацкая магіла з яго рэшткамі была перанесена на вуліцу

Першамайскую, у сквер імя генерала Пуганава, які таксама загінуў у баях за горад Кобрын у першыя дні вайны і пахаваны там жа. Такім чынам, рэшткі лётчыка-героя А. І. Марозава знайшлі вечны супакой у брацкай магіле ў скверы імя Пуганава.

25 лютага 1945 г. А. І. Марозаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна. Усяго 22 гады было лётчыку Арсенію Марозаву, які атрымаў гэта вышэйшае і самае ганаровае званне за подзвіг, дзейснены ў нашых краях. Лётчык узнагароджаны ордэнам Леніна і двума ордэнамі Чырвонага Сцяга.

Сёння прыгожы сквер у цэнтры горада, дзе першапачаткова быў пахаваны Герой, вуліца ў горадзе ў раёне аэрадрома носяць імя А. І. Марозава.

**Марозаў** Арсен Іванавіч // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси / рэдкал. А. У. Языковіч (гал. рэд.), мастак В. А. Ляхар. – Мінск, 2010. – С. 625-626.

**Марозаў** Арсен Іванавіч // Памяць: гісторыка-культурная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 233. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

**Морозов** Арсений Иванович // Их именами названы…: энциклопедический справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.] – Минск, 1987. – С. 432.

**Морозов** Арсений Иванович // Навечно в сердце народном : [книга о Героях Советского Союза] / гл. редактор П. У. Бровка. – Минск, 1977. – С. 320.

**Морозов** Арсений Иванович // Кто есть кто в Республике Беларусь. 2005 : к 60-летию Победы в Великой Отечественной войне / автор-сост. А. И. Котов. – Минск, 2005. – Т. 1. – С. 220.

О воспитаннике ОСОАВИАХИМа А. И. Морозове, Герое Советского Союза, воздушном ассе Великой Отечественной, который был смертельно ранен 24 июля 1944 г. и похоронен в Кобрине.

**Морозов** Арсений Иванович // Летопись, обагренная кровью / редкол.: И. В. Дырман [и др.]. – Минск, 2015. – С. 13 -14.

**Ярохін, А.** Апошні вылет / А. Ярохін // Людзі з сэрцам Данкі : па мясцінах подзвігаў “вогненных” пілотаў / А. Ярохін. - Мінск, 1989. - С. 85-88.

Пра Героя Савецкага Саюза А. І. Марозава, імем якога названы сквер, вуліца ў г. Кобрыне.

**Лесик, И.** Письма герою / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. – 2014. - 19 ліпеня. – С. 3.

Письма из будущего Герою Советского Союза лётчику-истребителю старшему лейтенанту Арсению Морозову.

**Фридлендер, Н.** «Нет героев от рожденья, они рождаются в боях…» / Наталья Фридлендер // Кобрин-информ. – 2014. – 17 июля. – С. 11.

О Героях Советского Союза – В. Кирмановиче, А. Морозове.

**Рысь, Е.** Погибшие за Родину в полете, мы вечно продолжаем наш полет…/ Елена Рысь // Кобрынскі веснік. – 2012. – 28 студзеня. – С. 9.

О подвиге А. И. Морозова.

**Светлый** день освобождения // Кобрынскі веснік. – 2007. - 21 ліпеня.

Освобождение Кобрина, подвиг А. И. Морозова.

**Александровіч, Б.** У 44-м, пад Кобрынам / Б. Алекскандровіч // Беларусь. - 1978. - № 9. - С. 19.

Пра Героя Савецкага Саюза А. І. Марозава, які загінуў у баях за Кобрын.

**Жаркоў, Я.** Як загінуў герой Арсеній Марозаў / Я. Жаркоў // Камуністычная праца. - 1967. - 11сакавіка.

**Подзвіг** лётчыка. Герой Савецкага Саюза Арсеній Іванавіч Марозаў // Яны вызвалялі наш горад: да 70-годдзя вызвалення г. Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў : бібліяграфічны летапіс / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнікі: С. Д. Курачук, Л. П. Сысоева. – Кобрын, 2014. – С. 21.

**Вуліца** Марозава // Думаць пра жывых, памятаць пра загінуўшых : даведнік па вуліцах Кобрына, якія носяць імёны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнікі: С. Д. Курачук, Т. М. Аляшкевіч – Кобрын, 2004. – С. 4-5.

## 105 гадоў з дня нараджэння І. Ф. Мілаяніна

